ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 28 (675) | Субота, 10 ліпеня 1948 года. | Цана 50 кап.

Палепшыць якасць выдаваемых кніг і часопісаў

Гэтымі днямі па ўказанню Цэнтральнага Камітэта КП(б)Беларусі была праведзена пашыраная нарада па пытанню выдання кніг і часопісаў у БССР. На гэтай нарадзе была падвергнута рэзкай большэвіцкай крытыцы нездавальняючая работа нашых выдавецтваў у галіне выпуску добраякасных кніг і часопісаў для нашага народа.

Добрая кніжка, як вядома, адыгрывае велізарную выхаваўчую ролю, яна дапамагае сваім зместам нашаму народу ў барацьбе за хутчэйшую пабудову комунізма. Кожная кніжка, будзь гэта падручнік, навуковая праца, мастацкі твор ці часопіс, з захапленнем чытаецца мільёнамі совецкіх грамадзян. Совецкі чытач любіць добрую змястоўную кнігу, з прагнасцю не толькі чытае яе, але і імкнецца набыць для сваёй уласнай бібліятэчкі. Кніжка за гады Совецкай улады трывала ўвайшла ў быт нашых грамадзян—не толькі служачых, але і рабочых і калгаснікаў, яна стала неад'емнай бытавой дэталлю совецкага чалавека, вольнага ад рабскіх ланцугоў капіталізма, дзе кніжка была прывілегіяй толькі выбраных, пануючых класаў. Вось чаму такія вялікія запатрабаванні нашага народа, нашай большэвіцкай партыі да зместу і якасці выдаваемых кніг і часопісаў. У іх недапушчальны не толькі памылкі ідэйныя ці навукова-пазнавальныя, але і недастаткова яркае і павярхоўнае адлюстраванне нашай рэчаіснасці. Совецкі чытач усебакова хоча з дапамогай кнігі папоўніць свае веды, глыбей пазнаць наша багатае зместам жыццё, знайсці ў гераічных вобразах вартыя прыклады пераймання патрыятычнаму служэнню Радзіме, атрымаць адказ на хвалюючыя пытанні. Усё гэта абавязвае нашы выдавецтвы даць як мага больш самых рознастайных змястоўных кніг і часопісаў.

За апошнія, пасляваенныя гады Дзяржаўнае Выдавецтва БССР выдала каля 20 мільёнаў кніг, але гэта зусім яшчэ недастаткова. За гады вайны нямецкія акупанты разбурылі нашы бібліятэкі, амаль поўнасцю знішчылі кніжны фонд, у асаблівасці творы класікаў марксізма-ленінізма і падручнікі. Гэта павінна было-б прымусіць нашы выдавецтвы асабліва ўважліва аднесціся да выдання гэтых кніг. На жаль, Дзяржаўнае Выдавецтва БССР паставілася да такой важнай справы няўважліва. Калі падручнікі выдаюцца больш-менш нядрэнна, дык творы класікаў марксізма-ленінізма—вельмі нездавальняюча. Да гэтага часу Выдавецтва надрукавала толькі адзін том Твораў І. В. Сталіна на беларускай мове і ніводнага тома Твораў В. І. Леніна.

Выданне Твораў Леніна—Сталіна на беларускай мове—вялікая, адказная і пачэсная задача, і Дзяржаўнае Выдавецтва БССР павінна звярнуць асаблівую ўвагу на гэтае пытанне.

Да гэтага часу Выдавецтва не цікавілася, якая кніжка больш патрэбна чытачу, друкавала кнігі па прынцыпу прыяцельскіх адносін да аўтара, або выпускала тыя кнігі, якія лягчэй было падрыхтаваць да друку, а часам проста тое, што трапляла пад руку. У выніку ў свет былі выпушчаны такія слабыя, павярхоўныя творы, як аповесць Садковіча і Львова «Георгі Скарына», безідэйныя нізкапробныя зборнікі вершаў С. Гарадзецкага, Л. Токарава, К. Цітова і інш. А такія кнігі, як «Ленін і Сталін у народнай творчасці», зборнік вершаў М. Танка «Каб ведалі», удастоены Сталінскай прэміі, яшчэ і да гэтага часу не выйшлі з друку.

Мала выпусціла Дзяржаўнае Выдавецтва БССР кніг аб героях социялістычнай працы, перадавіках сельскай гаспадаркі, майстрах высокіх ураджаяў. Ні навукова-даследчых прац, ні мастацкіх нарысаў, апавяданняў мы яшчэ не маем, як не маем твораў аб індустрыялізацыі нашай краіны, аб новабудоўлях у гарадах і сёлах. Нават аб такіх гігантах прамысловасці, як Мінскі аўтамабільны і трактарны заводы, якія змяняюць аблічча нашай рэспублікі, не выдадзена ніводнай кнігі.

Мала друкуюць і нашы часопісы «Беларусь» і «Полымя» мастацкіх твораў на гэтыя тэмы. Пакуль што зроблены толькі першыя крокі.

Добры пачын зрабіла Дзяржаўнае Выдавецтва БССР, выпусціўшы да 30-годдзя Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі серыю кніг нашых лепшых паэтаў, драматургаў і празаікаў. Але і ў гэтай справе не абыйшлося без значных хібаў, у выніку нядбайных і лёгкадумных адносін укладальнікаў і рэдактараў зборнікаў да даручанай ім справы. У выданнях паасобных пісьменнікаў былі змешчаны другарадныя мастацкія творы, а ў некаторых зборніках (Зм. Бядулі, Янкі Маўра і інш.)—нават першапачатковыя варыянты са значнымі палітычнымі памылкамі.

Такія-ж няўважлівыя, апалітычныя адносіны нашы выдаўцы выявілі і пры выданні падручнікаў для пачатковых і сярэдніх школ. За 1945—1947 гады былі надрукаваны Дзяржвыдавецтвам БССР падручнікі з палітычна-шкодныя памылкамі. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б указаў Выдавецтву на дапушчаныя памылкі і патрабаваў выправіць іх у бліжэйшы час. Дзяржаўнае Выдавецтва БССР сумесна з Міністэрствам Асветы БССР правялі значную работу па стварэнню новых высокаідэйных падручнікаў, але справа з выданнем іх да пачатку навучальнага году стаіць пад пагрозай. Друкарня імя Сталіна яшчэ слаба спраўляецца са сваімі абавязкамі, працуе павольна, без належнага напружання.

Яшчэ горш абстаіць справа ў друкарні з якасцю друкуемых выданняў.

Не гледзячы на тое, што ў друкарні імя Сталіна ёсць адпаведная паліграфічная база для выдання добраякасных, прыгожых кніг, аднак гэтая матэрыяльная база не скарыстоўваецца. Такое-ж становішча і ў Гродзенскай літаграфіі, дзе дырэкцыя лічыць лепшым друкаваць не каляровыя кнігі для дзяцей, а прыгожыя этыкеткі для цукерак, піўных бутэлек і запалкавых карабкоў.

Дзяржвыдавецтву БССР таксама трэба больш сур'ёзна аднесціся да мастацкага афармлення кніг, асабліва для дзяцей, не давяраць гэтую справу бяздарным і халтуршчыкам.

Час пакласці канец нядбайным, бяздушным адносінам да важнейшай дзяржаўнай справы—выдання добраякасных кніг.

Совецкі чытач чакае ад нашага Выдавецтва добрых, змястоўных кніг, самых рознастайных па зместу, афармленых з мастацкім густам, як гэта робяць другія выдавецтвы Совецкага Саюза.

Вялікі рускі народ аказваў і аказвае дапамогу нашаму народу. Сотні тысяч лепшых кніг і часопісаў, выдадзеных у сталіцы нашай Радзімы—Маскве, накіроўваюцца штодня ў Беларусь. Дзесяткі і сотні вышэйшых навучальных устаноў і гарадскіх бібліятэк адабралі са сваіх кніжных фондаў і прыслалі ў падарунак тысячы тамоў кніг нашым бібліятэкам гарадоў, сёл і навучальных устаноў.

У асаблівасці вялікія задачы ўскладаюцца на Выдавецтва ў сувязі з набліжэннем слаўнай 30-ай гадавіны нашай рэспублікі.

Дзяржаўнае Выдавецтва БССР павінна, як ніколі, напружыць усе свае сілы, каб забяспечыць нашы навучальныя ўстановы ў тэрмін новымі падручнікамі і варта сустрэць 30-годдзе рэспублікі выпускам новых кніг класікаў марксізма-ленінізма на беларускай мове, выданнем лепшых арыгінальных твораў беларускіх совецкіх пісьменнікаў.

Больш змястоўных, добрааформленых і рознастайных кніг для нашага совецкага чытача!

СВЯТА ПЕСНІ

*

З. КАСТРЫЦКІ

*

Чацвертага ліпеня беларускі народ ўрачыста адзначыў дзень вызвалення горада Мінска і ўсёй Совецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Натоўпы святочна апранутых мінчан з усіх канцоў горада спяшаліся ў Парк культуры і адпачынку імя Горкага. У памяці многіх засталіся свежымі тыя гарачыя дні, калі воіны Совецкай Арміі ішлі на захад, змятаючы на сваім шляху гітлераўскія зграі. Мільёны людзей, якія пакутвалі ў фашысцкай няволі, чакалі свайго вызвалення. І яно прышло. Гэта было чатыры гады таму назад. А сёння Мінск—у рыштаваннях, Мінск будуецца. Кругом пануе радаснае ажыўленне, спявае і весяліцца беларускі народ. Зноў ён стаў вольным, зноў стаў шчаслівым.

Сярод густой зелені ў Парку—пляцоўка велатрэка. Чырвоныя сцягі, партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада ўзвышаюцца над морам галоў. У канцы пляцоўкі—падмосткі, на якіх поўкругам выстраіўся чатырохтысячны хор працоўных Мінска. Наш народ умее і любіць працаваць, умее і любіць весяліцца. Тут—рабочыя, служачыя, студэнты, прадстаўнікі ўсіх пластоў насельніцтва, Грандыёзнае відовішча прадстала перад мінчанамі. Пачалося свята песні. Песні, якая дапамагала ў барацьбе, песні, якая дапамагае будаваць.

На свята прыйшлі кіраўнікі партыі і ўрада Беларусі, работнікі мастацтва, рабочыя, служачыя, калгаснікі, інтэлігенцыя. Сярод іх—сакратары ЦК КП(б)Б Н. Гусараў, М. Іаўчук, Н. Зімянін, старшыня прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. Казлоў, начальнік Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР П. Лютаровіч, старшыня ЦСПСБ І. Бельскі, народная артыстка СССР Л. Александроўская, заслужаны дзеяч мастацтва кампазітар Я. Цікоцкі, Галоўны сакратар Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР П. Броўка, сакратар Мінскага Гаркома КП(б)Б П. Грудзін, старшыня Мінскага Горсовета К. Длугашэўскі, сакратар Гаркома КП(б)Б па прапагандзе С. Саламаха і інш.

* * *

На трыбуну да мікрафона падняўся старшыня Мінскага Горсовета К. Длугашэўскі. У сваёй уступнай прамове ён сказаў:

— Працоўныя Мінска прарабілі вялікую працу па аднаўленню сваёй сталіцы. Адноўлены дзесяткі фабрык і заводаў, з кожным днём вырастаюць усё новыя і новыя будынкі. Горад не толькі адбудоўваецца, але і будуецца. Растуць гіганты прамысловасці—трактарны і аўтамабільны заводы. Наш слаўны горад Мінск будзе яшчэ прыгажэйшым, чым ён быў да Вялікай Айчыннай вайны. Адбудоўваць беларускую сталіцу дапамагаюць нам усе народы Совецкага Саюза. Сталінская дружба народаў СССР з кожным днём усё больш і больш умацоўваецца. Дазвольце вітаць вас,—заканчвае гав. Длугашэўскі сваю прамову,—са святам 4-ай гадавіны з дня вызвалення Мінска і Беларусі ад нямецкіх захопнікаў. Няхай жыве Комуністычная партыя большэвікоў, якая вядзе наш народ ад перамогі да перамогі! Няхай жыве наш родны і любімы Сталін!

Да мікрафона падыйшоў галоўны дырыжор Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужаны артыст рэспублікі Г. Пятроў. Ён узмахнуў рукамі, і хор у суправаджэнні духавога аркестра заспяваў знаёмую і родную ўсім песню—Гімн Совецкага Саюза. Магутныя гукі велічнага гімна луналі над многалюднай мэсай прысутных.

Толькі закончылася спяванне гімна, як радыёрэпрадуктары абвясцілі:

— Зараз будзе выканана песня «Мы беларусы». Музыка Сакалоўскага, словы Клімковіча.

Роўна, зладжана і дружна загучэла папулярная беларуская песня, у якой услаўляецца сталінская дружба народаў СССР.

Калі гэтая меладычная песня закончылася, яе хутка змяняе другая. Мы чуем аркестровы ўступ вядомай беларускай песні лаўрэата Сталінскай прэміі І. Любана «Бывайце здаровы», Мелодыю падхоплівае хор, і разам з аркестрам па Парку панесліся знаёмыя гукі, якія вы можаце часта пачуць і на вёсцы, і ў рабочым клубе, і на гулянні і ўсюды, дзе збіраецца моладзь. Па гэтай песні на ўсесаюзных аглядах мастацкай самадзейнасці пазнаюць каляктывы Беларускай Рэспублікі.

Гэтую песню наш народ любіць не толькі за прастату мелодыі, але і за тое, што яна не пазбаўлена сапраўднага народнага гумару. Песня «Бывайце здаровы» адлюстроўвае заможнае жыццё калгаснікаў нашай рэспублікі. Вясёлая беларуская песня, якую смела можна назваць народнай, змяняецца другой баявой песняй, песняй-заклікам, звернутым да перадавой дэмакратычнай моладзі.

Выконваецца «Марш дэмакратычнай моладзі», музыка лаўрэата Сталінскай прэміі А. Новікава, словы Л. Ашаніна.

Яе любіць не толькі совецкая моладзь, але і дэмакратычная моладзь усяго свету. Гэты марш спявае моладзь Заходняй Еўропы, Азіі, Амерыкі і Афрыкі, усе, хто ўдзельнічаў у міжнародным фестывалі дэмакратычнай моладзі ў Празе.

Духавы аркестр даў гучны ўступ. Хор падхапіў прыгожую мелодыю. Здавалася, заспявала ўся многатысячная маса прысутных. Такое магутнае і, разам з тым, выразнае гучанне набывала гэтая песня. «Такую песню не задушыш, не заб'еш». І як-бы ў пацверджанне гэтаму, мы чуем дружную пераклічку асобных груп галасоў, якія сімвалізуюць сабой пераклічку народаў, дэмакратычнай рэволюцыйнай моладзі, якая ўпэўнена змагаецца за новае светлае жыццё, якая смела выступае супроць імперыялістычна-захопніцкіх тэндэнцый міжнароднай рэакцыі.

Па жаданню прысутных, песні «Мы беларусы» і «Марш дэмакратычнай моладзі» выконваліся па два разы.

У заключэнне хор выканаў «Песню аб Сталіне» (музыка кампазітара С. Палонскага, словы лаўрэата Сталінскай прэміі К. Крапівы). Напеўна і магутна гучала песня, у якой беларускі народ выносіць падзяку Вялікаму Сталіну за сваё шчаслівае жыццё.

* * *

Хор, які выступіў 4 ліпеня 1948 года, аб'ядноўваў 40 харавых каляктываў Мінска. Сярод іх—рабочыя трактарнага завода, аўтамабільнага, аўтапрамбуда, велазавода, фабрык «Комунарка», імя Куйбышава, імя Фрунзе, імя Тэльмана, імя Кагановіча, друкарні імя Сталіна, студэнты медыцынскага, палітэхнічнага, педагагічнага, лесатэхнічнага, юрыдычнага інстытутаў, Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта, рабочыя і служачыя будаўнічых трэстаў—1-га, 2-га, 3-га, артысты Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, радыёкамітэта, а таксама калгаснікі з вёскі Лошыца.

* * *

Першае свята песні ў Беларусі было праведзена ў Баранавічах. Абласны дом народнай творчасці, пры актыўным удзеле маладога этнографа і гарачага папулярызатара беларускай народнай песні Г. Цітовіча, правёў выступленне харавых каляктываў вобласці ў дзень Перамогі — 9 мая 1948 года. У дзень вызвалення Беларусі зводныя хоры 500 чалавек выступалі ў гарадах Віцебску і Гродні, 700 чалавек—у Рэчыцы, 400 чалавек—у Гомелі.

Свята песні зрабілася традыцыяй, якая пашырылася на ўсю Беларусь. Рыхтуюцца да выступленняў зводныя хоры ў Маладзечне, Бабруйску і іншых гарадах рэспублікі. 17 верасня Свята песні будзе праведзена ў Брэсце. Гэта—сведчанне вялікага росту харавой культуры ў нашай рэспубліцы.

Неаднаразовае выступленне харавых каляктываў БССР—вёсак Вялікае Падлессе, Азяршчыны, Юравічаў і іншых—на Усесаюзных аглядах мастацкай самадзейнасці ў Маскве паказалі, што ў беларускім народзе жыве незлічонае багацце народнай песні. Як зазначыў выдатны рускі хормайстра Свешнікаў, дыяменты цудоўных беларускіх народных мелодый захоўваюцца ў нашым народзе, мастацтва якога мае доўгую гісторыю, але па-сапраўднаму яно расквітнела толькі ў вольнай Совецкай Беларусі, пасля Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Не працяжныя, журботныя песні гучаць цяпер у нашым народзе, а вясёлыя, радасныя песні. На калгасным полі жанчыны і мужчыны заспявалі бадзёрую песню пра сваю шчаслівую долю, якую яны здабылі ў краіне социялізма. Совецкая моладзь дзякуе партыі і ўраду за права на працу, на асвету і адпачынак, што дала ім вялікая Сталінская Канстытуцыя. Наш народ зрабіўся адзіным і маналітным толькі дзякуючы геніяльнай палітыцы нашай слаўнай большэвіцкай партыі. Народныя песні і песні совецкіх кампазітараў расказваюць аб вялікіх пераўтварэннях, якія адбыліся ў нашай краіне, яны ўсхваляюць герояў гістарычных заваёў на франтах Вялікай Айчыннай вайны і на фронце мірнай працы.

* * *

Да позняга вечара весяліўся народ у Парку імя Горкага—танцаваў, гуляў, спяваў. На эстрадзе выступаў самадзейны ансамбль песні і танца прамысловай каапярацыі і Чорнаморскі ансамбль чырвонафлотцаў, які прыехаў да нас з Севастопаля. На вуліцах Мінска ўвесь дзень гучалі песні на многіх мовах народаў СССР, песні совецкіх кампазітараў.

Артысты тэатра імя Янкі Купалы на Мінскім вакзале перад ад'ездам у Маскву на гастролі.

Фота Г. Бугаенкі.

Поспех беларускага тэатральнага мастацтва

Маскоўскі глядач добра ведае каляктыў старэйшага тэатра Беларусі—Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцягу драматычнага тэатра імя Янкі Купалы. Пяць разоў прыязджаў у сталіцу нашай Радзімы тэатр, ад прыезда да прыезда заваёўваючы ўсё большыя і большыя сімпатыі масквічоў. Асабліва памятны гастролі тэатра ў дні дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, калі за спяктаклі «Апошнія» М. Горкага, «Хто смяецца апошні» К. Крапівы, «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка і «Партызаны» К. Крапівы артысты былі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод.

Шосты прыезд тэатра ў Маскву ў ліпені 1948 года, упершыню пасля грозных гадоў вайны, выклікаў асаблівую цікавасць у сталічнай грамадскасці. Масквічы падоўгу спыняліся каля афіш і рэклам тэатра. Гэтая цікавасць праявілася ў прыёме, аказаным каляктыву ў дзень яго прыбыцця ў Маскву на вакзале.

Напярэдадні першага гастрольнага спяктакля майстры совецкай кінематаграфіі запрасілі ў Дом кіно каляктыў тэатра імя Я. Купалы. Тут адбылася сустрэча беларускіх артыстаў з выдатнымі дзеячамі кіно. Вітаючы гасцей, народны артыст СССР, лаўрэат Сталінскай прэміі, аўтар і пастаноўшчык вядомай кіно-карціны—«Клятва» М. Чыаурэлі сказаў:

— Ваш прыезд у Маскву—вялікая радасць для ўсіх нас, дзеячоў совецкага мастацтва, социялістычнай культуры. Вы прыехалі ў сталіцу нашай Радзімы, вы будзеце выступаць у Маскоўскім Мастацкім Акадэмічным тэатры, у гэтай своеасаблівай Акадэміі, дзе лёгка праверыць сябе, выпрабаваць свае сілы, атрымаць натхненне на яшчэ большыя поспехі. Вы ў Маскве, дзе жыве і працуе вялікі Сталін; гэта натхніць вас на далейшыя творчыя імкненні да стварэння высокаідэйных і хвалюючых твораў мастацтва.

Л. М. Літвінаў у сваёй прамове расказаў аб творчым шляху тэатра, прыезд якога ў Маскву з'яўляецца дэманстрацыяй поспехаў каляктыва за яго амаль 30-гадовае існаванне. Дакладчык падзяліўся вопытам работы тэатра з драматургамі Беларусі па стварэнню беларускіх п'ес.

Пасля абмена прывітаннямі прысутным у Доме кіно быў паказаны ўрывак з п'есы Янкі Купалы «Паўлінка» і новы фільм студыі «Совецкая Беларусь»—«Родныя напевы». Сцэны з п'есы і кіно-карціна былі цёпла сустрэты гледачом.

... 6-га ліпеня 1948 года ўзнялася заслона Маскоўскага Мастацкага Акадэмічнага тэатра імя Горкага, заслона з эмблемай чайкі. Тэатр Горкага і Чэхава, Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі, тэатр шматгадовых традыцый упершыню за час свайго існавання гасцінна даў сваё памяшканне братняму беларускаму тэатру.

Маскоўскі глядач з асаблівым святочным настроем сустрэў гасцей. Гэты настрой выявіўся з першай хвіліны, калі заслона была ўзнята і ў праменнях пражэктара ўзнік помнік Герою Совецкага Саюза Канстанціну Заслонаву, а пасля—беларускі пейзаж: бярозы, занесеныя снегам, партызаны ў лесе. Гром апладысментаў быў узнагародай мастаку Ушакову. Між іншым, апладысменты суправаджалі ўвесь спяктакль, ажыццёўлены таленавітым рэжысёрам, лаўрэатам Сталінскай прэміі К. Саннікавым. Кожная ўдалая мізансцэна, яскравая рэпліка, выразны гэст актора — усё сустракалася авацыямі, якім не было канца.

Найвялікшы поспех выпаў на долю лаўрэата Сталінскай прэміі народнага артыста БССР Барыса Платонава, які выконваў ролю Заслонава. З уласцівай гэтаму актору мяккасцю і выразнасцю стварыў ён вобраз легендарнага беларускага партызана, чыя дзейнасць дапамагала знішчэнню нямецка-фашысцкіх войск, якія ірваліся да Масквы. Не меншы поспех выпаў і на долю народнага артыста СССР, двойчы лаўрэата Сталінскай прэміі Глеба Глебава, які выконваў ролю Кроплі, І. Ждановіч (Аня Крушына), В. Дзядзюшкі (Крушына) і інш.

Упэўнена вёў аркестр дырыжор Б. Кунін; музыка кампазітара Д. Лукаса з'явілася каштоўным кампанентам спяктакля.

7-га ліпеня «Канстанцін Заслонаў» ішоў паўторна. 8 і 9 ліпеня тэатр паказаў масквічам трагедыю Шакспіра «Рамео і Джульета» ў перакладзе К. Крапівы і пастаноўцы Л. М. Літвінава.

Гастролі Беларускага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы—у цэнтры ўвагі маскоўскай грамадскасці. Усе маскоўскія газеты удзяляюць тэатру вялікае месца, штодзённа змяшчаюць артыкулы і рэцэнзіі аб спяктаклях і аб тэатры.

Творчыя сустрэчы каляктыву купалаўцаў рыхтуе Усерасійскае Тэатральнае Таварыства, Дом Актора, Цэнтральны Дом работнікаў мастацтва СССР.

М. ГЕНАДЗЬЕЎ.

Масква

Памяці пісьменніка-воіна

Гэтымі днямі па ініцыятыве сакратарыята ССП Беларусі і Палітаддзела пагранічных войск Міністэрства Унутраных Спраў Беларускай Акругі ў клубе Кіраўніцтва пагранічных войск быў праведзены літаратурны вечар, прысвечаны памяці пісьменніка-пагранічніка Івана Шапавалава, які загінуў на фронце Вялікай Айчыннай вайны.

На вечары прысутнічалі прадстаўнікі Палітаддзела, афіцэры-пагранічнікі, рускія і беларускія пісьменнікі.

Вечар адкрыў Галоўны сакратар ССП БССР Пятрусь Броўка.

Даклад аб жыцці і творчай дзейнасці І. Шапавалава зрабіў Я. Садоўскі.

З успамінамі аб пісьменніку-воіну выступілі палкоўнік А. Сідарэнка і падпалкоўнік Л. Шапіра.

У заключэнне паэты Д. Кавалёў, А. Бурдзель, І. Клаз і М. Аўрамчык прачыталі свае вершы.

Выстаўка праектаў планавання і забудоўляў райцэнтраў

Мінскі абласны аддзел па справах архітэктуры арганізаваў выстаўку праектаў планіровак і забудоўляў 6 раённых цэнтраў Мінскай вобласці—Крупкі, Смалявічы, Плешчаніцы, Бягомль, Лагойск і Мар'іна-Горка.

На стэндах, побач з картамі раённых цэнтраў, якія адлюстроўваюць стан будаўніцтва, — генеральныя планы планіровак і забудоўляў. Па кожнаму раёну складзена растлумачальная запіска да генеральнага плана, у якой даны характарыстыка прыродных умоў, тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне праекта, інжынернае абсталяванне і упарадкаванне тэрыторыі райцэнтра.

Пасля грамадскага прагляду і заключэння экспертнай камісіі генеральныя планы забудоўляў райцэнтраў будуць прадстаўлены на зацверджанне Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. (БЕЛТА).

Насустрач вялікаму юбілею

Да 30-годдзя БССР Магілеўскі абласны аддзел культурнаасветчых устаноў праводзіць агляд работы бібліятэк, клубаў і хат-чыталень. Ужо падведзены папярэднія вынікі агляду. Сярод бібліятэк першае месца заняла Мсціслаўская раённая бібліятэка. Добра наладжана культурна-асветная работа ў Пашкаўскай хаце-чытальні, Магілеўскага раёна і Пачкаўскай — Мсціслаўскага раёна.

Пры Пашкаўскай хаце-чытальні налічваецца 728 экземпляраў мастацкай і палітычнай літаратуры, больш 200 пастаянных чытачоў. Тут праведзена тры канферэнцыі чытачоў — па раману «Маладая гвардыя» — А. Фадзеева, «Аповесці аб сапраўдным чалавеку»—Б. Палявога. Рэгулярна працуе агітбрыгада з 12 чалавек, якую ўзначальвае настаўнік Платоненка. Пры хаце-чытальні працуюць чатыры гурткі: драматычны, харавы, музычны і танцавальны.

Лекцыі на літаратурныя тэмы

За апошні час у калгасах, сельсоветах і промарцелях рэспублікі лектарамі рэспубліканскага лекцыйнага бюро прачытана звыш 35 лекцый на літаратурныя тэмы.

З вялікай цікавасцю праслуханы лекцыі: «Совецкі патрыятызм у мастацкай літаратуры», «Партызанская вайна ў літаратурнай творчасці», «Рэволюцыйна-дэмакратычныя погляды В. І. Бялінскага», «Жыццё і творчая дзейнасць А. М. Горкага», «Народны паэт Беларусі Янка Купала», «Аповесць аб сапраўдным чалавеку» Б. Палявога — выдатны твор совецкай літаратуры», «Калгасная праца ў вобразах мастацкай літаратуры» («Паднятая цаліна» — М. Шолахава, «Брускі»—Панфёрава, «Краіна Муравія» — Твардоўскага) і шмат іншых.

На такія тэмы для сельскага насельніцтва былі прачытаны лекцыі работнікамі абласных аддзелаў культасветустаноў. Толькі ў чэрвені прачытана звыш 830 лекцый. Асабліва добра наладжана работа па распаўсюджванню літаратурных ведаў сярод сельскага насельніцтва ў Гомельскай, Бабруйскай, Магілеўскай і Віцебскай абласцях.

Вечары памяці Янкі Купалы

У Мінскім Палацы піонераў адбыўся дзіцячы ранішнік, прысвечаны шостай гадавіне з дня смерці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

Малодшы навуковы супрацоўнік музея Янкі Купалы Я. Пікуліна зрабіла даклад аб жыцці і творчасці паэта.

Аб вялікай любві Я. Купалы да совецкіх дзяцей расказвала дырэктар музея Ул. Луцэвіч.

У заключэнне піонеры дэкламавалі вершы народнага паэта.

* * *

Вечар, прысвечаны памяці народнага песняра Беларусі Янкі Купалы, адбыўся ў рэспубліканскай школе піонерважатых. Вечар адкрыла сакратар комсамольскай арганізацыі школы Н. Кабановіч.

Даклад аб жыцці і творчасці паэта зрабіў А. Кучар. Піонерважатая С. Ліпская, Н. Зухта і Н. Дзядок прадэкламавалі вершы Я. Купалы, пасля чаго школьны хор выканаў «Песню аб Сталіне», «Мы беларусы» і др.

У глыбінных раёнах Беларусі

Тэатр драмы і камедыі Беларускай Дзяржаўнай эстрады наведаў глыбінныя раёны рэспублікі—Барукова (Полацкая вобласць), Новая Мыш, Карэлічы, Любча, Клецк, Несвіж (Баранавіцкая вобласць), Бяроза-Картузская, Малэ-Рыта (Брэсцкая вобласць). Каляктыў паказаў спяктаклі: «Платон Крэчат» А. Карнейчука, «Дзень адпачынку» В. Катаева, «Чалавек з таго свету» Слабадскога і Дыхавічнага.

М. ПАСЛЯДОВІЧ, І. ГРАМОВІЧ

ГЭТА БЫЛО Ў ЗАЗЕР'І...

З вялікім хваляваннем набліжаліся мы да Зазер'я. Тут пушчана адна з міжкалгасных гідраэлектрастанцый. Яшчэ з высокага насыпу Седчанскага чыгуначнага палатна відаць стройныя лініі слупоў электраперадачы. Па жытніх і аўсяных палях, то ўзбіраючыся на шырокія хібы ўзгоркаў, то спускаючыся ў лагчыны, яны ідуць на Такарню і Пярэжыр, на Забічаны і Зазерку. Яшчэ жоўтыя ад нядаўняй скоблі, слупы ўзвышаюцца над цёмназялёнымі вішнёвымі прысадамі калгаса «Перамога».

Стараючыся скараціць свой шлях, мы пайшлі вузкай палявой сцежкай. Навакол нас уздымалася густая сцяна жыта. Неўзабаве мы дагналі чалавека ў керзавых ботах і бывалай салдацкай гімнасцёрцы. Паглядаючы заклапочаным позіркам на буйнае цяжкое калоссе, ён ішоў разважлівым, удумлівым крокам гаспадара.

— Чыё гэта жыта?

— Наша. Калгаса «Перамога».

— Выдатны ўраджай!

На загарэлым твары чалавека ў салдацкай гімнасцёрцы мільганула гордая ўсмешка.

— Такога мы і хацелі, — адказаў нам праз некаторы час. — Мяркуем сабраць не менш, як па 20 цэнтнераў з кожнага гектара. Бачыце, як хораша яно наліваецца? Гэта ўсё ад падкормкі, ад сталага догляду! Праўда, пасеялі мы яго ўвосень на добраапрацаванай зямлі. Але яно не было-б такое, каб не баранавалі ўвесну, не падкармлівалі і не праполвалі ад пустазелля.

Мы развіталіся з гэтым чалавекам і рушылі далей. Хутка мінуўшы вопытныя ўчасткі бульбянай даследчай станцыі, апынуліся мы на беразе Свіслачы. Распытваць дарогу на электрастанцыю ўжо не было патрэбы. Яе паказвалі нам тоўстыя медзяныя жылы правадоў. Пабліскваючы на сонцы, яны вялі да будынку, які ўзвышаўся над грэбляй.

Тут, у светлай прасторнай залі гідраэлектрастанцыі, мы ўспомнілі гутарку каля жыта. Мы не ведаем, хто быў чалавек у керзавых ботах: старшыня калгаса, брыгадзір ці радавы калгаснік. Але было відаць, што ён меў не малое дачыненне да важкіх каласоў і цяпер з хваляваннем і нецярплівасцю сачыў за іх далейшым ростам. Якая вялікая радасць хлебароба адчувалася ў яго голасе, што жыта «хораша наліваецца!»

Гідраэлектрастанцыя стаяла на рамонце. Вада, якая яшчэ нядаўна напружана раўла ў жалезных лопасцях турбін, цяпер бесклапотна і ляніва струменіла пад узнятымі заставамі плаціны. Чацвёра рабочых пакручвалі ламамі шырокае махавое кола доўгага вала: яны даставалі з вады другую турбіну.

У Мінскай абласной канторы сельэлектра ведаюць, калі была пушчана гэтая гідраэлектрастанцыя і колькі часу яна працавала. Напэўна пра гэта ведаюць і ў самім трэсце. І нас здзівіла тая недаравальная, мякка кажучы, бесклапотнасць і неахайнасць, з якой паставіліся некаторыя інжынеры і кіраўнікі да даручанай ім партыяй і ўрадам важнейшай справы. Інжынер Сокалаў, тэхнік Віктар Паскробка, прараб Павел Шайбак сваімі вачыма бачылі, з якім вялікім уздымам нарыхтоўвалі калгаснікі дрэва і каменне, як імкліва і настойліва праводзіліся лініі. За самы кароткі час у калгасе «Першае жніўня» было электрыфікавана 49 хат, у калгасе «Барацьба» — 110. 177 кватэр рабочых і спецыялістаў соўгаса Зазер'е і даследчай станцыі атрымалі электрычнае святло. Энергія Свіслачы, ператвораная ў электрычнасць, круціла зернеачышчальныя машыны, сячкарні, гантарэзкі. Людзі пачалі ўжо думаць аб электраматорах для малацьбы новага багатага ўраджаю. І раптам электрастанцыя, магутнасць якой у гадзіны самай большай нагрузкі выкарыстоўвалася толькі напалову, спыніла сваю работу і стала на рамонт.

Пра гэта нічога не ведалі, або не хацелі ведаць, ні інжынер Сокалаў, ні тэхнік Паскробка. Здаўшы па акту электрастанцыю, яны з таго часу зусім на ёй не бывалі. Яны нават не выканалі тых недароба́к, якія адзначаліся ў здатачным акце. Мы не ведаем, хто з гэтых людзей вінаваты менш, а хто больш. Гэтай справай павінны заняцца іншыя арганізацыі і ўстановы. Нас абурае чыноўніцкі, бюракратычны падыход Мінскай абласной канторы сельэлектра да сваіх абавязкаў. Гэтая кантора заключыла ўмову з новай электрастанцыяй на тэхнічную дапамогу і кансультацыю, патрабавала, каб электрастанцыя неадкладна перавяла грошы за кансультацыю за год наперад. Але з дня здачы электрастанцыі ў эксплаатацыю ніводзін чалавек «з кансультацыі» нават свайго носу не паказаў у Зазер'е.

Недаробкі і неахайны мантаж далі сябе адчуць. Хутка пасля пуску зламалася шруба галоўнага мацавачня, і адна з турбін выйшла са строю. Дзяжурныя электраманцёры сяк-так паставілі новую шрубу. Але неўзабаве дрэнны мантаж адчуўся і на другой турбіне. Вядучая яе шасцярня, замацаваная на валу не шчыльна падагнанай шпонгай, расхісталася. 12 мая электрастанцыя спыніла работу.

Толькі праз месяц, пасля неаднаразовых напамінанняў і патрабаванняў з Зазер'я, з'явіліся тут прадстаўнікі Мінскай канторы сельэлектра. Але і пасля іх прыезду мала што змянілася. Рамонт ідзе вяла, і невядома, калі ён будзе скончаны. Не адчуваецца тут таго хвалявання і неспакою, якімі павінен гарэць чалавек справы, творчы работнік.

Мы ведаем архітэктараў, якія нецярпліва чакалі, калі задуманыя імі планы будынкаў ператворацца ў прыгожыя сцены, у сонечныя аўдыторыі інстытутаў і школ. Мы ведаем інжынераў, якія ажыццяўлялі гэтыя задумы архітэктараў. З якой пашанай праходзілі яны каля створаных імі будынкаў! Праходзілі не таму, што ў іх была заключана ўмова на «тэхнічную кансультацыю». Іх прыводзіў сюды творчы неспакой, руплівая душа гаспадара: паглядзець, ці ўсё добра яны зрабілі і што можна зрабіць яшчэ лепш! Яны прыслухоўваліся, яны самі распытвалі, што скажуць людзі пра іх работу.

Чыноўнікі з Мінскай канторы сельэлектра, відаць, зусім не цікавяцца, што скажуць пра іх работу. Яны ўзяліся пабудаваць электрастанцыю, здаць яе, больш правільна — збыць са сваіх рук, а там хоць трава не расці...

* * *

На цягнік мы пайшлі праз калгас «Новы шлях». Гэта чатыры кілометры ад Зазер'я па дарозе на Рудзенск. У канцы вёскі Караваева, на беразе Свіслачы, былі звалены прывезеныя з лесу бярвенні. Рухавы хлапец, падкасаўшы да кален штаніны, спяшаўся са стракатай рэйкай у руках уздоўж грэблі.

— Што ты тут робіш з гэтай рэйкай?

— Здымаем план,—адказаў ён.— Вунь наш гідратэхнік. Будзем будаваць калгасную электрастанцыю. Бачылі, колькі мы навазілі бярвення!

Няўжо такія справы не хвалююць работнікаў Мінскай канторы сельэлектра? Нас абураюць бюракратычныя чыноўніцкія адносіны да таго, што робіцца ў Зазер'і. Перашкоды на шляху такога важнейшага мерапрыемства, як электрыфікацыя калгаснай вёскі, павінны быць знішчаны. Гэтага патрабуюць інтарэсы нашай соцыялістычнай дзяржавы, нашай совецкай грамадскасці.

Сустрэча беларускіх мастакоў з народным мастаком СССР А. Герасімавым

Гэтымі днямі ў Мінск прыехаў старшыня Саюза мастакоў СССР, прэзідэнт Акадэміі мастацтва Саюза ССР, народны мастак СССР А. Герасімаў. Ён наведаў Усебеларускую выстаўку, што знаходзіцца ў файэ Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, беларускую Дзяржаўную Карцінную галярэю і майстэрні асобных беларускіх мастакоў, дзе пазнаёміўся са старымі творамі нашых мастакоў і з іх новымі работамі, якія яны рыхтуюць да Усебеларускай выстаўкі, прысвечанай 30-годдзю заснавання БССР.

3-га ліпеня ў Саюзе мастакоў БССР адбылася сустрэча А. Герасімава з беларускімі мастакамі, дзе старшыня Саюза мастакоў СССР выступіў з вялікай прамовай.

Ён сказаў:

— Пастановы нашай партыі аб літаратуры і мастацтве, што з'явіліся пасля Вялікай Айчыннай вайны, высунулі перад намі, мастакамі, рад складаных задач, якія мы павінны неадкладна вырашыць у сваёй творчасці ў самы бліжэйшы час. Мы, совецкія мастакі, з задавальненнем адзначаем, што партыя нам дапамагла выкрыць фармалізм на фронце выяўленчага мастацтва і разбіць яго за некалькі год да Пастановы аб оперы Мурадэлі «Вялікая дружба». Партыя нам напомніла, што нельга забываць, што сёння перад намі стаяць пытанні крытычнага авалодання класічнай спадчынай, пытанні народнасці нашых твораў, бо мастакі павінны глыбока адлюстроўваць сучаснае жыццё совецкага народа.

— Ці правільна мы выкарыстоўваем спадчыну рускага выяўленчага мастацтва? — пытаецца таварыш Герасімаў. — Я пазнаёміўся з творамі беларускіх мастакоў на маскоўскіх выстаўках і цяпер тут, у Мінску, і прыйшоў да выводу, што вы дрэнна выкарыстоўваеце вопыт работы нашых рускіх класічных майстроў па стварэнню карцін. У некаторых беларускіх мастакоў пераважае ўмоўны шэры тон. Адкуль-жа ён бярэцца? Жыццё наша радаснае, светлае, аптымістычнае, значыць — не шэрае. Дык вось, трэба верыць не розным фармалістычным тэорыям, а ўласнаму вопыту: пішы тое, што бачыш, а не тое, чаго не ведаеш. Карціны павінны адлюстроўваць наша сучаснае рознастайнае жыццё. На Украіне мастакі гэта добра зразумелі, таму і вынікі ў іх станоўчыя.

Тон змяняецца, але форму карціне дае рысунак, бо ён больш сталы. На рысунак беларускія мастакі мала звяртаюць увагі. У некаторых нашых мастакоў ёсць пачуццё, тэмперамент, але няма майстэрства. Гэта можна сказаць і пра асобных беларускіх мастакоў. Я цяпер быў у Літве і бачыў, што выпускнікі мастацкай акадэміі не ўмеюць рысаваць. Іхнія работы нагэтулькі бездапаможныя і па рысунку і па тону, што іх ніхто не набудзе. Але дыпломнікі гэтага не разумеюць і нават захапляюцца сваімі бездапаможнымі работамі. Маладыя мастакі павінны быць перадавымі ва ўсім, а яны іншы раз нават не ведаюць, як падыйсці да работы над карцінай.

Мне-б хацелася спыніцца на тым, як падыходзіць да пісання карціны. У нас, у Маскве, мастакі ў сэнсе напісання эцюдаў дасягнулі значных поспехаў. Пісанне эцюдаў і ў беларускіх мастакоў пастаўлена добра. Аднак мастак павінен яшчэ ведаць і той момант, калі яму можна пераходзіць ад эцюда да напісання карціны. Я быў у некалькіх майстэрнях беларускіх мастакоў і пераканаўся, што і ў вашых жывапісцаў няма правільнага падыхода да напісання карціны. Мастак заўсёды павінен ісці ад рэчаіснасці. Значыць, эцюд павінен быць не прыблізны, а дакладны, такі, з якога ўжо можна было-б пісаць карціну. Пры гэтым трэба не забывацца на тое, што думка карціны павінна быць ясная. Выбіраючы тэму, неабходна памятаць аб тым, каб яна мастаку была блізкая, адпавядала яго задуме, каб ён дасканала ведаў тое, што ён бярэцца пісаць.

Другім падрыхтоўчым момантам у напісанні карціны ў мастака з'яўляецца збіранне эцюдаў. Да карціны пішуцца эцюды пейзажаў, тыпажа, асобных жанравых сцэн, адзення і г. д., што творча дапамагае адлюстроўваць жыццё. Калі матэрыял сабраны, мастак ведае перспектыву, тады ўжо можна прыступіць і да напісання карціны. Як працаваць над карцінай, мы павінны вучыцца ў нашых старых рускіх мастакоў. Фармалісты часта нас папракаюць тым, што як-быццам мы цягнем да старых метадаў працы. Яны гавораць, што новы змест патрабуе новай формы. Бясспрэчна. Але форма ствараецца ўсім ходам гісторыі мастацтва, а не адарвана ад жыцця, недзе ў майстэрнях асобных мастакоў. Наватарамі могуць быць толькі тыя людзі, якія добра ведаюць сваю справу. Перш чым ствараць новае, неабходна авалодаць веданнем таго мастацтва, якое створана да нас.

Некаторыя нашы мастакі гавораць, што яны таму выстаўляюць незакончаныя рэчы іншы раз, каб не скаціцца да натуралізма. Але я схільны думаць, што прычына тут у тым, што яны проста не могуць давесці сваёй работы да канца. Натуралістычнай карціна атрымаецца тады, калі мастак будзе бяздумна, абыякава, як фатограф, заносіць усё, што трапляецца на вока, на палатно, без пэўнага асэнсавання матэрыяла. А калі ў карціне ёсць думка, дык гэта будзе рэалістычны твор. Успомнім, як Ленін гаварыў, што калі мастак асэнсоўвае навакольную рэчаіснасць, калі адлюстроўвае яе ў фарбах на палатне, надае твору пэўную думку, дык гэта якраз і ёсць тое, чаго мы патрабуем сёння ад рэалістычнага мастацкага твора.

Нашы адносіны да замежнага мастацтва. Мы — супроць рэакцыйнага буржуазнага мастацтва. Мне два месяцы давялося жыць у Парыжы і бачыць, што там робіцца. На выстаўцы, дзе я быў, — 5 тысяч работ, але няма ніводнай, якая-б мяне парадавала. Гэта ўсё такія рэчы, якія нават нам, прафесіяналам, і то цяжка зразумець. Але якасць работы вызначаюць там не харастро палатна, а грошы. Каб выставіць карціну, трэба плаціць, за рэцэнзію на свае работы таксама плаці, за ўсё — грошы і толькі грошы. Мне давялося пазнаёміцца з кнігай французскага мастацтвазнаўцы Андрэ Форшэ «Калекцыі і калекцыянеры» з характэрным для капіталістычнага мастацтва падзагалоўкам — «Як купляць і як прадаваць». Гэта даведнік па ўсіх пытаннях мастацтва, у якім прыведзены нават кантракты гаспадароў з мастакамі. Калі вы пакідаеце выстаўку, зам даюць такую кніжачку на ўспамін. Хабарніцтва даходзіць да таго, што ў мясцовых парыжскіх саматужных мастакоў, майстэрні якіх завуцца «акадэміямі», бо там працуюць і вучацца некалькі вучняў, вы можаце нават не вучыцца, а проста купіць дыплом аб сканчэнні гэтай так званай «акадэміі». І ў такой саматужнай «акадэміі» мне таксама давялося бываць. Іх там шмат, іншыя з іх нават прыкрываюцца імем выдатных французскіх мастакоў, але пасутнасці гэта звычайныя крамы.

Мы не супроць усяго французскага мастацтва. Мы супроць рэакцыйнага мастацтва. У Францыі ёсць дэмакратычныя мастакі, якія, праўда, не трапляюць на гэтыя афіцыйныя выстаўкі, але затое яны праўдзіва паказваюць жыццё свайго народа, разам з якім яны змагаюцца цяпер з французскай рэакцыяй. Мы не супроць французскіх мастакоў, калі яны пішуць так рэалістычна, як Курбэ ці Дэлакруа, але мы супроць фармалістаў.

Наша совецкае мастацтва ідэйна-глыбокае. Яно развіваецца па шляху соцыялістычнага рэалізма. І гэтым шляхам ідзе і беларускае совецкае мастацтва.

У творах беларускіх мастакоў ёсць яшчэ сляды фармалізма, і ад іх трэба як найхутчэй пазбавіцца. Неабходна памятаць, што совецкія мастакі — перадавыя мастакі сучаснасці.

— Мы жывем з вамі ў шчаслівы час, — гаворыць у заключэнне А. Герасімаў, — калі наша краіна ўпэўнена крочыць да комунізма, і мы будзем сведкамі гэтага светлага будучага. Значыць, адставаць нам не да твару. Нам трэба ідэйна расці, авалодваць марксізмам - ленінізмам, тады мы яшчэ глыбей адлюструем нашу рэчаіснасць. Наша жыццё багатае падзеямі, гэта цэлая легенда, і мастак павінен бліжэй стаяць да жыцця. Ён павінен ствараць свае карціны на тым матэрыяле, які ён бачыць не толькі з вакна сваёй майстэрні. Жадаю беларускім мастакам не адстаць ад украінскіх, якія прарабілі значную працу па стварэнню карцін на сучасныя тэмы.

Пасля афіцыйнай прамовы А. Герасімаў сустракаўся асабіста з некаторымі беларускімі мастакамі, дзе выказаў свае заўвагі аб іх работах.

Увечары ён быў запрошаны на ўрачысты вечар, прысвечаны 4-ай гадавіне вызвалення Мінска і Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

4-га ліпеня А. Герасімаў пакінуў Мінск у суправаджэнні маскоўскага мастака Н. Дзенісоўскага.

Сустрэча беларускіх мастакоў з народным мастаком СССР А. Герасімавым мела вялікае выхаваўчае значэнне.

Да прыезду прэзідэнта Акадэміі мастацтва Саюза ССР, народнага мастака СССР А. Герасімава ў Мінск. На здымку: А. Герасімаў сярод групы беларускіх мастакоў. Фота Г. Бугаенкі.

Гастролі тэатра імя Янкі Купалы ў Маскве

6 ліпеня ў памяшканні МХАТ'а спяктаклем «Канстанцін Заслонаў» пачаў свае гастролі ў Маскве Беларускі Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатр імя Янкі Купалы. Мастацкі кіраўнік тэатра народны артыст СССР Г. Глебаў заявіў:

— Кожны прыезд нашага тэатра ў Маскву пакідае глыбокі след у творчай біяграфіі тэатра. Мы з хваляваннем чакалі сёнешняй сустрэчы з масквічамі. Гледачы сталіцы вельмі цёпла прынялі наш першы спяктакль. Тэатр прабудзе ў Маскве да 1 жніўня і пакажа 5 пастановак.

(БЕЛТА).

Мастакі да 30-й гадавіны БССР

Мастакі Гродзеншчыны рыхтуюць да 30-й гадавіны Беларускай ССР новыя карціны на рэспубліканскую выстаўку. Тав. Пушкоў працуе над карцінай «Кавалерыйская атака». Мастак Марозаў рыхтуе серыю замалёвак на тэму «Гродня сёння», тав. Кох—партрэты перадавых стаханаўцаў вобласці.

(БЕЛТА).

Паэзія Совецкай Беларусі

*

А. АЛЯКСЕЕЎ

*

Выдадзеная ў Ленінградзе «Анталогія беларускай паэзіі»*) ахоплівае больш чым цэлае стагоддзе ў развіцці нашай літаратуры. Тут прадстаўлена ўся паэзія за гэта стагоддзе, ад такіх выдатных твораў першай паловы XIX века, як «Тарас на Парнасе», да лепшых вершаў і паэм самых маладых совецкіх паэтаў.

Ленінградскае аддзяленне Саюза совецкіх пісьменнікаў прарабіла велізарную работу, якая ўжо знайшла і яшчэ знойдзе ўдзячны водгук у беларускай совецкай грамадскасці. Упершыню рускі чытач атрымлівае такую поўную анталогію беларускай паэзіі. На пераклад вершаў быў арганізаваны вялікі калектыў у складзе лепшых паэтаў Ленінграда. У якасці перакладчыкаў тут выступаюць А. Пракоф'еў, М. Лазінскі, Н. Браун, В. Саянаў, В. Раждзественскі, В. Бяргольц, М. Камісарава, А. Рэшатаў, А. Чывіліхін, В. Владзіміраў, Л. Друскін, Б. Кежун, Т. Сямёнаў, Л. Хаустаў, І. Непельбаум, П. Кабзарэўскі, Е. Рывіна, Д. Леванеўскі, І. Аўраменка, Е. Палонская, В. Азараў, І. Садоф'еў, В. Шэфнер, А. Астраўскі, Е. Вячтомава, А. Андрэеў, С. Арлоў, Е. Серабро́ўская, Н. Бутава. У «Анталогію» ўключаны таксама ўрыўкі з выдатнага пераклада М. Ісакоўскага паэмы «Сцяг брыгады» А. Куляшова.

З кнігі паўстае ва ўсёй сваёй велічы жыццё беларускага народа, чго мінулае і сучаснае. Вялікае месца ў творах займае вобраз мужнага, непахіснага змагара супроць царызма, памешчыкаў і капіталістаў. Яшчэ шырэй раскрыта аблічча совецкага чалавека — патрыёта сваёй Радзімы, бязлітаснага барацьбіта супроць іншаземных захопнікаў, дбалага творцы-будаўніка.

На працягу доўгага часу лібяральныя пісьменнікі і літаратары прадстаўлялі беларускі народ дарэволюцыйнай пары забітым, пазбаўленым прымянення чалавечых здольнасцей. Яшчэ Дабралюбаў нанёс сакрушальны ўдар па гэтаму ілжываму прадстаўленню. Ён пісаў:

«Адносна беларускага селяніна справа даўно вырашаная. Забіты канчаткова, так што нават пазбавіўся прымянення чалавечых здольнасцей. Не ведаем, у якой ступені ілжыва гэта меркаванне, таму што не вывучалі спецыяльна беларускага краю; але верыць яму, зразумела, не можам. Цэлы край так вось узялі і забілі, як-бы не так... Ва ўсякім выпадку пытанне пра характарыстыку беларусаў павінна хутка быць растлумачана працамі мясцовых пісьменнікаў. Паглядзім, што яшчэ скажуць самі беларусы». (Н. А. Дабралюбаў, «Выбраныя філасофскія творы», Дзяржаўнае выдавецтва палітычнай літаратуры, т. II, стар. 261).

Пытанне пра характар беларусаў было растлумачана самімі беларусамі. Шматлікія сялянскія паўстанні XIX стагоддзя растлумачвалі гэты характар; самаадданая і мужная барацьба на барыкадах рэволюцыі 1905 года растлумачвала гэты характар; змаганне супроць памешчыцка-капіталістычнага ладу, удзел рабочых і сялян Беларусі ў моцным саюзе з вялікім рускім народам у Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі растлумачвалі гэты характар; будаўніцтва пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна соцыялістычнага грамадства, барацьба супроць нямецкіх акупантаў, бяспрыкладная мужнасць народных мас у гэтай барацьбе растлумачылі нам гэты характар. Пераможны рух, у дружнай сям'і братніх народаў, да вяршынь комунізма таксама растлумачвае характар беларуса.

Іменна такі вобраз беларускага народа паўстае з «Анталогіі беларускай паэзіі».

Ужо ў раннім творы нашай літаратуры XIX стагоддзя, у «Тарасе на Парнасе» (цудоўны пераклад М. Лазінскага, змешчаны ў анталогіі) беларускі селянін паўстае, як кемны, дасціпны, які не губляецца ні ў якіх абставінах жыцця. Гэтыя якасці яшчэ больш выразна выявіліся і ў пазнейшых творах нашай літаратуры.

Усяго адзін верш пакінуў нам Паўлюк Бахрым — таленавіты самародак, прыгонны селянін. Але і ў ім выяўлена характэрная рыса працоўнага беларуса — свабодалюбства, жаданне волі, якое заўсёды жыло ў яго сэрцы. Амаль цалкам гэтаму прысвечаны творчасць Францішка Багушэвіча — выдатнага паэта-дэмакрата канца XIX стагоддзя.

Творчасць Багушэвіча, як і другіх выдатных прагрэсіўных дамакратычных пісьменнікаў, на ўсім працягу развіцця беларускай літаратуры фармавалася ў абставінах класавай барацьбы. Багушэвічу, прадстаўніку сялянскіх мас, даводзілася весці змаганне супроць лібяральна-шляхецкага кірунку ў нашай літаратуры, прадстаўленага Дуніным-Марцынкевічам, які імкнуўся ідэалізаваць узаемаадносіны паміж селянінам і памешчыкам.

Выхад на літаратурную арэну Янкі Купалы і Якуба Коласа з'явіўся цэлай эпохай у развіцці беларускай літаратуры. Яны паказалі ва ўвесь рост працоўнага беларуса-змагара супроць самаўладства, памешчыкаў і капіталістаў.

Гэтыя выдатныя песняры беларускага народа выхоўваліся на традыцыях рускіх рэволюцыйна-дэмакратычных пісьменнікаў і крытыкаў — Чарнышэўскага, Дабралюбава, Някрасава і выдатнага пісьменніка пролетарыята А. М. Горкага. Купала і Колас у сваёй творчасці заўсёды падкрэслівалі адзінства шляхоў і мэт у рускага і беларускага народа. Яны горача, палымяна заклікалі беларусаў падтрымаць рускіх рабочых і сялян у іх справядлівай барацьбе супроць царскага ладу, супроць памешчыкаў і капіталістаў.

Довольно спать! Восстаньте к бою!
Идите братьям помогать!
Восстаньте крепостью такою,
Чтоб враг не смог бы вас сломать!

Вобраз чалавека совецкай эпохі, яго цудоўныя рысы найбольш поўна прадстаўлены ў Анталогіі. Тут мы маем вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Пятра Глебкі, Піліпа Пестрака, В. Віткі, А. Бялевіча, А. Зарыцкага, К. Кірэенкі, А. Вялюгіна і др.

Беларус совецкай фармацыі выглядае з твораў нашых паэтаў якасна новым. Гэта свядомы патрыёт совецкай Радзімы, які для абароны яе заваёў не шкадуе ні сіл, ні самога жыцця. Ён адчувае сваю еднасць з усімі народамі Совецкага Саюза. З асаблівай любоўю ставіцца ён да братняга рускага народа. Ён яскрава ўсведамляе, што святло навукі і прагрэсу ідзе з Усходу. Ён люта ненавідзіць гнілую буржуазную культуру капіталістычнага свету, як і ўвесь яго лад эксплаатацыі і здзеку.

Найбольш поўна гэтыя рысы выяўлены ў вершах Я. Купалы — «Арлянятам», «Беларускім партызанам», Я. Коласа — «На захад» і ў паэме «Адплата», у паэме Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады», у вершах П. Броўкі «Кастусь Каліноўскі», М. Танка «Добра было-б», П. Панчанкі «У мяне не забілі нікога», П. Глебкі «Партызаны», А. Бялевіча «Смерць Маланні», А. Вялюгіна «Балада аб уральскім танку», В. Таўлая «Першамайскія сцягі». Чытаючы гэтыя творы, глыбей разумееш гістарычны шлях, пройдзены беларускім народам, яго вялікія заваёвы, якія здабыты пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна.

Ленінградскія паэты беражліва абышліся з творамі беларускай паэзіі. Яны далі добрыя, высокамастацкія пераклады. Асабліва вылучаюцца пераклады А. Пракоф'ева, Н. Брауна, М. Камісаравай, В. Раждзественскага, В. Саянава, В. Бяргольц. Ленінградскія пісьменнікі зрабілі добры падарунак беларусам да XXX-годдзя рэспублікі.

Выданне ў Ленінградзе «Анталогіі беларускай паэзіі» з'яўляецца значнай падзеяй у жыцці совецкай літаратуры. Аднак, каштоўнасць кнігі не павінна засланіць ад нас і недахопаў, памылак выдання.

Па-першае, адным з асноўных буйнейшых недахопаў кнігі з'яўляецца тое, што ў ёй слаба прадстаўлена беларуская пасляваенная паэзія, асабліва творы, прысвечаныя тэмам аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі, новабудоўлям рэспублікі. Няма тут такіх вершаў, як «Дом» А. Куляшова, «Новая восень» М. Танка, «Хлеб» П. Броўкі, «Зубр на радыятары» П. Панчанкі, вершаў аб трактарным заводзе — А. Вялюгіна, вершаў аб аднаўленні гарадоў — К. Кірэенкі, аб калгасным жыцці — А. Бялевіча.

Па-другое, вершы некаторых паэтаў падабраны такім чынам, што ствараюць уражанне пэўнай аднастайнасці нашай паэзіі. Галоўным чынам вар'іруюцца тэмы прыгажосці беларускага пейзажа і пакут народа ў часе Айчыннай вайны.

У Анталогію трапілі асобныя нехарактэрныя творы. Так, верш «Галубкі» — не адзін з моцных і характэрных твораў Куляшова. Залішне змрочным з'яўляецца верш П. Панчанкі «Адплывае на захад гарматны гром», адчуваецца пасівізм у вершы А. Вялюгіна «Бежанцы» і ў вершы Ніны Тарас «У Нямеччыну».

У зборнік уключаны асобныя творы недастатковай ідэйнай накіраванасці, як, напрыклад, «Зося» В. Віткі, «Вясёлка» А. Бялевіча, зусім слабы верш А. Русака «Жніўная песня».

У вершы К. Кірэенкі «Беларусь» залішне механічна ўстанаўліваецца агульнасць нашай барацьбы супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў з барацьбой нашых далёкіх продкаў супроць сваіх ворагаў. Верш А. Вялюгіна «У дарозе» поўны непраўдападобных і непаэтычных пераўвелічэнняў.

Беларусь, Беларусь... ни конца и
ни краю...
Не об'ездишь и в год города.
Если в Орше сады зацветают, —
В Бресте яблони (?) зреют тогда.
. . . . . .
А с верхушек могучих дубов
Беловежья
Вижу
Снегом покрытый Кавказ...

Выклікае недаўменне ўключэнне ў Анталогію ідэйна-заганнага верша М. Лужаніна «Васількі».

Побач з адзначанымі вышэй добрымі, сапраўды мастацкімі перакладамі, мы маем у Анталогіі асобныя пераклады, якія слаба перадаюць дух арыгінала. Такім з'яўляецца пераклад А. Чывіліхіна верша Максіма Танка «З Умшлягпляцу», дзе замест суровых танкавых радкоў пераважаюць расслаблена-сантымянтальныя. Недакладныя радкі сустракаюцца і ў перакладзе В. Бяргольц верша Танка «Добра было-б»; замест выраза «Мне-ж трэба нанава ўсё пачынаць», мы маем тут: «я же всю жизнь начинаю сполна» (?). Нават у вельмі добрым перакладзе В. Саянава «Песні кулікоў» укралася мясціна, якая няправільна характарызуе героя Танка:

Под крестьянской крышей
я родился тоже,
Был и там, где в горе сын твой
изнемог.

А між тым, у Танка ён «не изнемог», а толькі «гаруе».

Наогул вершам Танка не пашанцавала. Яны перакладзены мала таго, што не дакладна, у іх слаба адчуваецца пафас паэта.

Найлепш у гэтым сэнсе і найбольш поўна прадстаўлены Пімен Панчанка. Асабліва добра перакладзены яго вершы «З іранскага дзённіка» і верш «У мяне не забілі нікога».

У асобных мясцінах Анталогіі чытача раздражняе неахайнасць складальнікаў, якія пераблыталі асобныя факты і даты. Так, сказана, што П. Броўка скончыў Універсітэт у 1938 годзе, а на самай справе ён яго скончыў у 1931 годзе. Пад вершам Панчанкі «Далёкія станцыі» стаіць дата 1941 год, а трэба 1944 год. Пад вершам Таўлая «Аб маіх вершах» стаіць дата 1945 г., а трэба 1941 г. Пераблытаны радкі ў вершы «Летні дзень» П. Глебкі, а яго кніга «Хада падзей» названа «Движением надежд» і г. д.

Усе гэтыя недахопы, зразумела, істотныя, але яны не могуць засланіць той велізарнай і высакароднай справы, якую зрабілі ленінградскія пісьменнікі. Анталогія даволі поўна прадстаўляе рускаму чытачу паэзію беларускага народа. Яна яшчэ больш умацоўвае непарушную дружбу беларускага народа з вялікім рускім народам, з слаўным горадам-героем — Ленінградам.

Хочацца выказаць шчырую падзяку ўсім ленінградскім совецкім пісьменнікам, паэтам-перакладчыкам за выданне гэтай кнігі. Вялікай падзякі заслугоўваюць рэдактары кнігі — паэты Аляксандр Пракоф'еў і Нікалай Браун, якія нямала сіл аддалі і аддаюць умацаванню дружбы ленінградскіх пісьменнікаў з беларускай совецкай літаратурай.

*) Анталогія беларускай паэзіі. Пад рэдакцыяй Н. Брауна, П. Броўкі, П. Глебкі, Я. Коласа, А. Пракоф'ева. Ленінградскае газетна-часопіснае і кніжнае выдавецтва, стар. 648, 1948 год.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАРАДА Ў ЦК КП(б)Б ПА ПЫТАННЯХ ВЫДАННЯ КНІГ І ЧАСОПІСАЎ

Гэтымі днямі скончыла работу скліканая Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б нарада па пытаннях выдання кніг і часопісаў.

На нараду сабраліся пісьменнікі, вучоныя, работнікі выдавецтваў, часопісаў, рэспубліканскіх газет, кнігагандлюючых арганізацый і буйнейшых паліграфічных прадпрыемстваў рэспублікі.

У рабоце нарады прынялі ўдзел сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. М. Т. Іаўчук, віцэ-прэзідэнты Акадэміі навук БССР т. т. Якуб Колас і І. С. Лупіновіч, загадчык сектарам аддзела выдавецтваў Кіраўніцтва прапаганды ЦК ВКП(б) т. Ракін.

На нарадзе быў абмеркаваны даклад намесніка начальніка Кіраўніцтва прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б тав. Красоўскага — аб становішчы і мерах палепшання выдання кніг і часопісаў у БССР.

Былі таксама заслуханы судаклады: дырэктара Дзяржаўнага Выдавецтва БССР тав. Матузава, намесніка старшыні рэдакцыйна-выдавецкага совета АН БССР тав. Лупіновіча, рэдактара часопіса «Беларусь» тав. Гурскага, рэдактара часопіса «Полымя» М. Танка і дырэктара друкарні імя Сталіна тав. Вержбаловіча.

Тав. Красоўскі ў сваім дакладзе адзначыў, што за пасляваенныя гады ў БССР выдадзена каля 20 мільёнаў экземпляраў кніг. Гэта стала магчымым дзякуючы вялікай дапамозе, аказанай Беларускай ССР Цэнтральным Камітэтам ВКП(б), саюзным урадам, народамі братніх Совецкіх Рэспублік і, перш за ўсё, вялікім рускім народам.

Дзяржаўным Выдавецтвам БССР надрукаваны першы том Твораў І. В. Сталіна, друкуецца другі том Твораў І. В. Сталіна, падрыхтаваны да друку першы і другі тамы Твораў В. І. Леніна і трэці том Твораў І. В. Сталіна; 50-тысячным тыражом выйшла «Кароткая біяграфія таварыша Сталіна», вялікімі тыражамі выдадзены рад асобных работ класікаў марксізма-ленінізма. Да 30-ай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі выйшла з друку Кастрычніцкая серыя выбраных твораў пісьменнікаў Совецкай Беларусі—Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка, П. Глебкі, Зм. Бядулі, К. Чорнага і іншых пісьменнікаў і паэтаў рэспублікі. Надрукаваны вялікімі тыражамі на беларускай мове выдатныя творы рускай класічнай літаратуры — А. С. Пушкіна, Л. Н. Талстога, І. С. Тургенева, А. М. Горкага і інш. Перакладзены на беларускую мову і выдадзены многа твораў сучасных пісьменнікаў РСФСР, Украіны, Грузіі і іншых братніх совецкіх рэспублік. У 1948 годзе Дзяржаўнае Выдавецтва БССР павялічыла выданні кніг і брашур, якія абагульняюць вопыт работы перадавікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі, а таксама масава-палітычнай і сельскагаспадарчай літаратуры для вёскі. Надрукаваны работы вучоных рэспублікі — сапраўднага члена АН БССР Нікольскага, прафесара Дазорцавай, прафесара Рагавога, кандыдата эканамічных навук тав. Малініна і інш.

Дзяржаўнае Выдавецтва БССР, безумоўна, дасягнула ў гэтым годзе некаторых поспехаў у палепшанні справы друкавання кніг. Пастановы ЦК ВКП(б) па ідэалагічных пытаннях, а таксама пастановы аб рабоце Аб'яднанага Дзяржаўнага Выдавецтва (Огиза) і аб паліграфічным афармленні кніг зрабілі велізарны ўплыў на павышэнне ідэйнага ўзроўню выдаваемай літаратуры і садзейнічалі значнаму палепшанню справы друкавання кніг у нашай рэспубліцы.

Аднак, гаворыць тав. Красоўскі, не ўсе нашы работнікі выдавецтваў, не ўсе аўтары кніг зрабілі неабходныя вывады з гістарычных пастаноў ЦК ВКП(б) па ідэалагічных пытаннях. У змесце некаторых выдадзеных Дзяржаўным Выдавецтвам БССР кніг былі дапушчаны сур'ёзныя палітычныя памылкі і ідэалагічныя скажэнні.

Асабліва сур'ёзныя памылкі дапушчаны рэдакцыяй дзіцячай і юнацкай літаратуры Выдавецтва. У нашым друку ўжо паведамлялася аб памылках, зробленых пры выданні кнігі Янкі Маўра «Вакол свету». Гэтыя памылкі сталі магчымымі таму, што Выдавецтва без сур'ёзнага адбору і работы з аўтарам сабрала ўсе творы Янкі Маўра, у тым ліку надрукаваныя ў 1924 — 27 гг. Рэдактар кнігі І. Гурскі замест таго, каб выправіць устарэлыя і палітычна няправільныя палажэнні, замест таго, каб дапамагчы аўтару перапрацаваць некаторыя яго творы, якія маюць вялікую цікавасць для юных чытачоў,— бяздумна, па-бюракратычнаму паставіўся да сваёй справы, падпісаўшы да друку зборнік. Калі кніга была перададзена для перапрацоўкі старшаму рэдактару рэдакцыі мастацкай літаратуры Выдавецтва тав. Бурносаву, той паверыў подпісу тав. Гурскага і, не чытаючы, падпісаў зборнік да друку. Гэта—прыклад таго, да чаго можа прывесці страта пачуцця адказнасці за даручаную справу, страта большэвіцкай пільнасці, якая так неабходна работнікам Выдавецтва.

Няўважліва падыйшло Выдавецтва да падбору выбраных твораў і інш. пісьменнікаў.

Далей тав. Красоўскі спыняецца на сур'ёзных недахопах і памылках, дапушчаных Міністэрствам Асветы і Выдавецтвам пры друкаванні падручнікаў у 1947 годзе.

Памылкі, зробленыя ў некаторых хрэстаматыях па беларускай літаратуры, з'явіліся своеасаблівым адбіткам нацыяналістычнай тэорыі «адзінай плыні». Гэтыя і іншыя памылкі былі ў свой час ускрыты Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б. У хрэстаматыю для 7-га класа былі ўключаны матэрыялы, у якіх ідэалізуецца дарэвалюцыйнае мінулае Беларусі; у той-жа час у гэтым падручніку не былі змешчаны лепшыя творы беларускай совецкай літаратуры. У хрэстаматыі для 6-га класа не было літаратурнага матэрыяла аб пасляваеннай сталінскай пяцігодцы. Многія падручнікі, перакладзеныя на беларускую мову, маюць вялікія дэфекты ў перакладах.

Таварыш Красоўскі падверг рэзкай крытыцы работу Выдавецтва і Рэдакцыйна-Выдавецкага Совета Акадэміі навук БССР. Нават у тых нязначных па колькасці кнігах, надрукаваных выдавецтвам АН БССР у мінулым годзе, былі зроблены сур'ёзныя памылкі палітычнага характару. Такія памылкі мелі месца ў рабоце Комарава «Аднаўленне жыллёвага і прамысловага фонда на аснове выкарыстання недэфіцытных будматэрыялаў», а таксама ў брашуры Гаркушы «Сістэма правільнай апрацоўкі глебы», выдадзенай у 1947 годзе.

Гаворачы аб рабоце часопіса «Полымя», тав. Красоўскі адзначыў, што часопіс прайшоў міма актуальных пытанняў тэорыі мастацтва і жывапісу. Рэдакцыя не выканала пастановы ЦК КП(б) Беларусі, у якой ад часопіса патрабавалася, каб, побач з друкаваннем буйных твораў беларускай прозы, паэзіі і драматургіі, друкаваліся сур'ёзныя крытычныя артыкулы па пытаннях літаратуры і мастацтва.

Часопіс «Беларусь» пакуль яшчэ не адказвае тым задачам, якія пастаўлены перад ім. Часопісу неабходна смялей пашыраць кола тэм, часцей змяшчаць на сваіх старонках кароткія, але яркія матэрыялы аб новабудоўлях нашай краіны, аб аднаўленні і далейшым уздыме народнай гаспадаркі Беларусі, аб жыцці Саюзных Рэспублік, аб гераічнай працы совецкіх патрыётаў.

Задача работнікаў нашых выдавецтваў, часопісаў, пісьменнікаў, гаворыць у заключэнне тав. Красоўскі, заключаецца ў тым, каб як мага хутчэй знішчыць недахопы і памылкі, забяспечыць сур'ёзнае палепшанне ўсёй сваёй дзейнасці, усёй работы Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, выдавецтваў, часопісаў, работы, якая павінна быць прасякнута духам ваяўнічай партыйнасці і высокай ідэйнасці, каб змест і афармленне выдаваемых кніг адпавядалі запатрабаванням совецкіх людзей — творцаў і будаўнікоў комунізма.

З судакладам аб выкананні плана выдання літаратуры на 1948 год выступіў дырэктар Дзяржаўнага Выдавецтва БССР тав. Матузаў.

— У 1948 годзе, — гаворыць тав. Матузаў, — Выдавецтва павінна выпусціць у свет 411 назваў кніг і брашур. Па стану на 25 чэрвеня, выдадзена 179 кніг і брашур. Надрукавана на рускай і беларускай мовах кніга К. Маркса і Ф. Энгельса «Маніфест комуністычнай партыі»; выдадзены кнігі І. В. Сталіна — «Аб Леніне» і «Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза». У бліжэйшы час выйдуць на беларускай мове кніга І. В. Сталіна «Пытанні ленінізма» і другі том Твораў І. В. Сталіна. У хуткім часе Выдавецтва прыступае да друкавання на беларускай мове 4-га выдання Твораў В. І. Леніна. Выдадзена 17 кніг і брашур грамадска-эканамічнай і масава-палітычнай літаратуры.

Выдавецтва надрукавала ў гэтым годзе 26 назваў кніг мастацкай літаратуры. Сярод іх — творы класікаў рускай літаратуры: Л. Н. Талстога—«Васкрасенне», Салтыкова-Шчадрына — «Казкі», Тургенева — «Бацькі і дзеці», Горкага — «Маці» і інш. З твораў беларускіх пісьменнікаў выдадзены ў гэтым годзе — «Аповесці» Я. Коласа, выбраныя творы Я. Купалы, К. Чорнага, А. Стаховіча і інш. пісьменнікаў. Выдавецтва надрукавала выбраныя вершы ленінградскага паэта, лаўрэата Сталінскай прэміі А. Пракоф'ева і анталогію «Паэты Ленінграда», якая знаёміць беларускіх чытачоў з лепшымі творамі ленінградскіх паэтаў.

Больш 20-ці кніг выдадзена ў 1948 годзе рэдакцыяй юнацкай і дзіцячай літаратуры. Выйшла на беларускай мове паэма Леанідзе «Сталін», зборнік вершаў Я. Купалы «Славуты домік», кніга беларускіх дзяцей «Ніколі не забудзем» (апавяданні дзяцей аб днях Вялікай Айчыннай вайны) і інш.

Рэдакцыя сельскагаспадарчай літаратуры надрукавала рад кніг і брашур, якія папулярызуюць вопыт перадавікоў калгаснай вёскі. Выдадзена два цікавыя зборнікі — «Перадавікі жывёлагадоўлі Совецкай Беларусі аб сваёй рабоце» і «Апавяданні майстроў высокіх ураджаяў аб сваім вопыце». Выйшлі ў свет рад папулярных брашур для сялян заходніх абласцей рэспублікі: «Упэўненым крокам» (аб калгасе імя Сталіна, Брэсцкай вобласці), «Калгас імя Янкі Купалы» (Маладзечанская вобласць) і інш. Надрукаваны цікавыя работы беларускіх вучоных і навукова-папулярныя брашуры. Павысіўся ідэйны ўзровень выдадзенай літаратуры.

Аднак, гаворыць далей тав. Матузаў, у рабоце Выдавецтва яшчэ не ліквідаваны сур'ёзныя недахопы.

У мінулым годзе быў выдадзены вялікі зборнік выбраных твораў Я. Маўра «Вакол свету». Рэдактары гэтай кнігі тав. Гурскі і Бурносаў безадказна аднесліся да сваёй справы і ўключылі ў зборнік старыя творы аўтара, у якіх ідэалізуюцца англа-амерыканскія і галандскія каланізатары, а рэакцыянер і амерыканскі паслугач у Кітаі Чан-Кай-Шы паказаны чуць не... рэвалюцыйным правадыром кітайскага народа.

Няўдала выдадзена ў мінулым годзе кніга З. Бядулі, у якую быў уключаны стары варыянт аповесці «Салавей», які, як вядома, у далейшым быў аўтарам перапрацаваны і палепшаны. Гэтыя факты сведчаць аб тым, што некаторыя работнікі Выдавецтва яшчэ не пазбавіліся заганных метадаў работы і лёгкадумнага падыходу да рэдагавання асобных кніг.

Тав. Матузаў гаворыць далей аб прынятых мерах да палепшання друкуемай літаратуры. Пры Выдавецтве, у адпаведнасці з рашэннем ЦК КП(б)Б, створаны Рэдакцыйны Совет, які ўжо абмеркаваў і падверг крытыцы рад кніг, якія звернуты аўтарам для ліквідавання недахопаў. Рэцэнзентамі і рэдактарамі Выдавецтва прызначае вучоных і спецыялістаў розных галін навукі і культуры. У рэдагаванні і рэцэнзіраванні кніг актыўны ўдзел прыймаюць пісьменнікі Броўка, Глебка, Танк, Куляшоў, Клімковіч, вучоныя прафесары Краўчук, Краўцоў, Замяцін і інш. Аднак, прызнае судакладчык, Рэдакцыйны Совет збіраўся яшчэ вельмі рэдка і не наладзіў справы так, як гэтага патрабаваў ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце Выдавецтва.

Тав. Матузаў падверг рэзкай крытыцы Міністэрства Асветы БССР за несвоечасовую падрыхтоўку да выдання арыгінальных падручнікаў. ЦК КП(б)Б абавязаў Міністэрства Асветы здаць у Выдавецтва ўсе арыгінальныя падручнікі да 15 красавіка 1948 года, між тым пяць падручнікаў, галоўным чынам «Хрэстаматыі па роднай літаратуры», яшчэ не здадзены. Тав. Матузаў крытыкуе таксама кіраўнікоў друкарні імя Сталіна за нездавальняючае афармленне кніг, якія часта выпускаюцца ў свет неахайна, дрэнна сшытымі, з бруднымі клішэ.

Калектыў Выдавецтва, гаворыць у заключэнне тав. Матузаў, разумеючы ўсю ўскладзеную на яго адказнасць, прыкладзе ўсе намаганні для таго, каб пазбегнуць недахопаў і карэнным чынам палепшыць справу выдання высокаякасных кніг для народа.

З судакладам аб дзейнасці выдавецтва Акадэміі навук БССР выступіў намеснік старшыні Рэдакцыйнага Совета Акадэміі тав. Лупіновіч.

— Выдавецкая работа Акадэміі навук, — гаворыць тав. Лупіновіч, — пачалася, па сутнасці, у пачатку 1943 года. У 1947 годзе было выпушчана ў свет два нумары «Паведамленняў Акадэміі навук БССР» (серыя гістарычная і геалагічная) і матэрыялы красавіцкай сесіі Акадэміі навук па тэхнічнаму аддзелу. На такое, гаворыць далей тав. Лупіновіч, зусім нездавальняючае і недапушчальнае становішча выдавецкай дзейнасці нам у мінулым годзе ўказваў ЦК КП(б)Б. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б абавязаў новы склад Прэзідыума АН БССР звярнуць асаблівую ўвагу на хутчэйшае наладжванне работы выдавецтва Акадэміі навук і выдавецкай дзейнасці АН БССР увогуле. У цяперашні час ужо многае зроблена ў гэтым напрамку. У 1948 годзе—мы ўжо выдалі 17 назваў кніг. Рад буйных работ вучоных выйдзе ў другім паўгоддзі.

У выданнях Акадэміі навук за 1947 год, гаворыць тав. Лупіновіч, было адзначана шмат памылак, у прыватнасці мелі месца элементы некаторага схілення перад замежнай буржуазнай навукай. Рэдакцыйны Совет Акадэміі і Прэзідыум карэнным чынам змянілі сістэму і парадак рэдакцыйнай работы над рукапісам. Зараз кожная, прызначаная да друку навуковая работа старанна разглядаецца на паседжанні Вучонага Совета інстытута і пасля адпаведнага ўдакладнення і выпраўлення накіроўваецца ў Рэдакцыйны Совет Акадэміі, які таксама абмяркоўвае работу і вызначае адказнага рэдактара з ліку буйных спецыялістаў па дадзенай галіне навукі.

На нарадзе былі заслуханы судаклады рэдактараў часопіса «Беларусь» тав. Гурскага і «Полымя» — М. Танка аб рабоце гэтых часопісаў за другую палову 1947 года і першую палову 1948 года.

— Часопіс «Беларусь», — гаворыць тав. Гурскі, — з'яўляецца літаратурна-мастацкім і грамадска-палітычным штомесячным органам Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і рэспубліканскага таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў. У мінулым годзе Цэнтральны Камітэт КП(б)Б указаў на сур'ёзныя недахопы і памылкі, дапушчаныя рэдакцыяй часопіса. Гэтыя памылкі былі таксама падвергнуты крытыцы ў нашым друку, на сходах пісьменнікаў і работнікаў беларускага совецкага мастацтва.

Зараз рэдакцыя дамаглася палепшання якасці публікуемага матэрыяла. У часопісу надрукавана шмат добрых артыкулаў, нарысаў, апавяданняў, п'ес і вершаў аб гераічнай барацьбе Совецкага народа за Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аб вялікай стваральнай працы народа за датэрміновае выкананне пасляваеннай Сталінскай пяцігодкі, на тэмы аб совецкім патрыятызме, сталінскай дружбе народаў.

Больш змястоўнымі і ідэйна-накіраванымі сталі публікуемыя ў апошні час творы мастацкай літаратуры. Часопіс надрукаваў аповесць М. Паслядовіча «Цёплае дыханне». Рэдакцыя лічыць, што, не гледзячы на некаторыя недахопы, гэты твор з'яўляецца адным з лепшых у беларускай прозе на тэму аб пасляваенных намаганнях совецкага народа па выкананню Сталінскага пяцігадовага плана. З другіх твораў беларускіх празаікаў, змешчаных у часопісу, вылучаюцца: «Канец лягенды» А. Міронава, «Вяселле ў Загор'і» І. Грамовіча. На старонках часопіса былі змешчаны лепшыя вершы М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі і інш. паэтаў. Зараз друкуецца паэма П. Броўкі, будуць змешчаны ўрыўкі з новага рамана М. Лынькова, М. Паслядовіча і інш. празаікаў.

Аднак, гаворыць тав. Гурскі, на старонках часопіса былі таксама надрукаваны сырыя, недапрацаваныя творы, такія, як вершы А. Астапенкі, апавяданні Папкоўскага; не былі на патрэбнай вышыні некаторыя літаратурна-крытычныя матэрыялы. Рэдакцыя змяшчала вельмі мала матэрыялаў аб жыцці совецкіх людзей у братніх совецкіх рэспубліках, слаба папулярызавала творы пісьменнікаў, удастоеных Сталінскай прэміі. Дрэнна яшчэ вядзецца ў часопісу аддзел крытыкі і бібліяграфіі. Не арганізавана водгукаў на цікавыя кнігі, якія абагульняюць вопыт стаханаўцаў прамысловасці і перадавікоў калгасаў. Рэдакцыя яшчэ далёка не ўсё зрабіла па рашучай перабудове сваёй работы з тым, каб выканаць гістарычныя пастановы ЦК ВКП(б) па пытаннях літаратуры і мастацтва.

Трэба адзначыць, што рад сур'ёзных недахопаў у рабоце часопіса «Беларусь» былі тав. Гурскім абыйдзены і не раскрытыкаваны.

— У аснову ўсёй працы па перабудове дзейнасці рэдакцыі часопіса «Полымя», — гаворыць М. Танк, — былі пакладзены пастановы ЦК ВКП(б) па ідэалагічных пытаннях. У мінулым годзе ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах аб рабоце Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і часопісаў «Полымя» і «Беларусь» ускрыў сур'ёзныя недахопы ў рабоце рэдакцый гэтых часопісаў. Справядлівая большэвіцкая крытыка, якой быў падвергнуты часопіс «Полымя», спрыяла выпраўленню памылак, зробленых рэдакцыяй. М. Танк пералічвае рад высокаякасных у ідэйных і мастацкіх адносінах твораў, надрукаваных у часопісу ў 1948 годзе. Разам з тым ён гаворыць аб сур'ёзных недахопах часопіса. М. Танк прызнае зусім правільнай тую крытыку, якая была адрасована часопісу ў дакладзе тав. Красоўскага і ў нашым друку.

З судакладам аб становішчы і мерах па палепшанню паліграфічнага афармлення выдаваемых кніг выступіў дырэктар друкарні імя Сталіна тав. Вержбаловіч. Трэба сказаць, што судаклад тав. Вержбаловіча быў не самакрытычным. Ён шмат гаварыў аб усялякіх аб'ектыўных прычынах, якія нібыта перашкаджаюць у рабоце друкарні, але не ўскрыў сапраўдных прычын нездавальняючай працы друкарні па паліграфічнаму афармленню кніг.

Пасля даклада і судакладаў разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Першым у спрэчках выступіў дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б тав. Чымбург.

— Крытыка, — гаворыць тав. Чымбург, — якой падвергся Інстытут за адставанне ў падрыхтоўцы да выдання Твораў В. І. Леніна і І. В. Сталіна на беларускай мове, зусім справядлівая. Беларускі філіял ІМЭЛ адстае ў гэтых адносінах ад філіялаў іншых саюзных рэспублік. Зараз Інстытут гісторыі партыі прымае рад важных мерапрыемстваў, ажыццяўленне якіх забяспечыць выданне на беларускай мове к канцу гэтага года трох томаў Твораў В. І. Леніна і чатырох томаў Твораў І. В. Сталіна.

Тав. Шарахоўскі (галоўны рэдактар Дзяржаўнага Выдавецтва БССР) сказаў, што Інстытут гісторыі партыі не сочыць за высокаякаснымі перакладамі твораў Леніна і Сталіна, у выніку чаго пасля зацверджання перакладаў на Вучоным Совеце Інстытута былі заўважаны сур'ёзныя недахопы перакладаў; работнікі Інстытута трымаюць перакладзеныя томы па тры-чатыры месяцы і гэтым затрымліваюць іх выхад у свет. Тав. Шарахоўскі расказаў далей нарадзе аб падрыхтоўваемых Выдавецтвам юбілейных выданнях мастацкай літаратуры. Да 30-годдзя БССР выйдуць у свет у добрым афармленні асобныя кнігі выбраных твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, зборнік выбраных твораў паэтаў Беларусі і зборнік лепшых твораў беларускіх совецкіх празаікаў і драматургаў.

Галоўны Сакратар Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР П. Броўка паведаміў удзельнікам нарады, над чым працуюць зараз пісьменнікі Беларусі. Падрыхтаваны да друку рад новых твораў аб новых індустрыяльных гігантах БССР, аб гераічных буднях пасляваеннай пяцігодкі і аб усенародным партызанскім руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адзначыўшы рад недахопаў у рабоце часопіса «Полымя», тав. Броўка гаворыць, што ў сувязі з ростам новых літаратурных сіл варта паставіць пытанне аб павелічэнні фармата гэтага часопіса.

П. Броўка падверг рэзкай крытыцы работу кнігагандлюючых арганізацый рэспублікі. У некаторых сельскіх раёнах, гаворыць ён, вельмі яшчэ мала новых беларускіх кніг. Гандлюючыя арганізацыі не вядуць неабходнай работы па папулярызацыі выдадзеных кніг. Вельмі слаба пастаўлена бібліяграфія і паведамленні аб надрукаваных кнігах у нашым друку.

Член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР К. Крапіва спыніўся на рабоце выдавецтва АН БССР.

Выдавецтва Акадэміі, гаворыць ён, усё яшчэ павольна і нерашуча пераадольвае памылкі і недахопы, ускрытыя ў яго рабоце. К. Крапіва гаворыць далей аб мерах, прынятых Прэзідыумам АН БССР да паскорання выхада руска-беларускага слоўніка і іншых навуковых прац, якіх чакае ўся грамадскасць рэспублікі.

Тав. Мінкелевіч (Белкніжкультгандаль) гаварыў аб недахопах у распаўсюджванні кніг і арганізацыі кніжнага гандлю. Работнікі совецкага кніжнага гандлю закліканы энергічна распаўсюджваць літаратуру сярод мас працоўных. Але работа Белкніжкультгандлю і іншых кнігагандлюючых арганізацый яшчэ не задавальвае патрабаванні нашых чытачоў.

Тав. Чаускі (рэдактар часопіса «Вожык») расказаў нарадзе аб рабоце, якая вядзецца рэдакцыяй часопіса для пашырэння кола аўтараў, для таго, каб зрабіць «Вожык» часопісам палітычна завостранай сатыры і гумару, рашуча ліквідаваць недахопы і памылкі, ускрытыя ЦК КП(б)Б і грамадскасцю рэспублікі, і ўсёй сваёй дзейнасцю актыўна дапамагаць большэвіцкай партыі комуністычнаму выхаванню працоўных. Тав. Чаускі падверг справядлівай крытыцы работнікаў друкарні імя Сталіна за дрэннае паліграфічнае выданне часопіса, крытыкаваў заганны стыль у рабоце дырэктара друкарні тав. Вержбаловіча.

Удзельнікі нарады з вялікай увагай выслухалі цікавую прамову народнага паэта БССР Якуба Коласа.

Многія недахопы літаратурных твораў нашых пісьменнікаў, гаворыць Якуб Колас, тлумачацца тым, што некаторыя пісьменнікі дрэнна яшчэ валодаюць літаратурнай мовай і слаба працуюць над яе ўдасканаленнем. Я. Колас заклікае пісьменнікаў вучыцца літаратурнай мове ў карыфеяў рускай класічнай літаратуры. Літаратурная мова для пісьменнікаў,—гаворыць народны паэт, — гэта як вада для рыбы, або крыллі для птушкі. Недахопы некаторых твораў тлумачацца таксама тым, што пісьменнікі слаба пранікаюць у жыццё, дрэнна вывучаюць нашу выдатную совецкую рэчаіснасць, слаба звязаны з народам, працоўнымі масамі, мала бываюць на фабрыках, заводах, у калгасах і сёлах нашай рэспублікі.

Калі пісьменнік хоча мець поспех у сваёй творчай працы, ён павінен быць шчыльна звязаным са сваім народам, жыццём, вучыцца ў народа, шчодра чэрпаць яго мудрасць, яго вопыт, заўсёды памятаць, што кнігі ў совецкай краіне пішуцца для шырокіх працоўных мас, а не для вузкага кола аматараў «прыгожай славеснасці».

Якуб Колас гаворыць далей аб ідэалагічных памылках, дапушчаных Дзяржаўным Выдавецтвам БССР, у якім да нядаўняга часу не было сур'ёзнага падыходу да работы з аўтарамі кніг.

Звяртаючыся да пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, усіх работнікаў совецкага мастацтва і совецкай літаратуры Беларусі, Якуб Колас гаворыць у заключэнне:

— Яшчэ раз і яшчэ раз бліжэй да народа, да працоўных мас, бліжэй і паўней знаёмства з тымі працэсамі, якія адбываюцца ў нашай вялікай совецкай краіне, што ўпэўнена ідзе пад кіраўніцтвам геніяльнага Сталіна да комунізма!

Старшы рэдактар дзіцячай і юнацкай літаратуры Белдзяржвыдавецтва А. Якімовіч сказаў, што работа Выдавецтва па стварэнню дзіцячай кнігі падверглася на нарадзе справядлівай крытыцы. Важнейшая справа па напісанню высокаякасных твораў для юных чытачоў да гэтага часу недаацэньваецца пісьменніцкай грамадскасцю. Тав. Якімовіч паведаміў нарадзе аб мерах, якія прыняты і прымаюцца для рашучага палепшання справы друкавання дзіцячай і юнацкай кнігі.

Пісьменнік М. Клімковіч прысвяціў сваё выступленне пытанням літаратурнай крытыкі, адзначыў сур'ёзныя недахопы ў галіне крытыкі, яе адставанне і неаператыўнасць.

Тав. Вадэйка (Міністэрства Асветы БССР) прызнаў, што работа Міністэрства Асветы па падрыхтоўцы падручнікаў заслужана крытыкавалася на нарадзе. Ён адзначыў таксама рад недахопаў Белдзяржвыдавецтва, у прыватнасці ў рабоце яго рэдакцыі вучэбна-педагагічнай літаратуры, якая павольна выдае метадычную літаратуру для настаўнікаў і наглядныя дапаможнікі для вучняў школ.

Загадчык аддзела Кіраўніцтва прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б тав. Росман, адзначыўшы выключную важнасць пытанняў, пастаўленых на абмеркаванне нарады, спыніўся на сур'ёзных недахопах кнігавыдавецкай справы ў рэспубліцы.

Пасля пастановы ЦК КП(б) Беларусі аб рабоце Дзяржаўнага Выдавецтва БССР работнікі Выдавецтва дамагліся некаторага палепшання сваёй дзейнасці. Аднак і цяпер у Белдзяржвыдавецтве прымаюцца яшчэ і дрэнныя кнігі, заганныя, якія маюць розныя памылкі і недахопы. Атрымліваецца гэта галоўным чынам таму, што кнігі даваліся на рэцэнзіраванне і рэдагаванне людзям не дасведчаным. У самы апошні час у Выдавецтве сталі некалькі больш строга падыходзіць да справы, але гэта яшчэ не ўсімі аўтарамі ўспрымаецца так, як належыць. Сур'ёзную дапамогу пачаў аказваць Выдавецтву створаны Рэдакцыйны Совет, у склад якога ўключаны вядомыя прадстаўнікі розных галін навукі і культуры сталіцы рэспублікі.

Тав. Росман падверг вострай крытыцы Міністэрства Асветы БССР за непаваротлівасць у падрыхтоўцы падручнікаў, за некрытычныя адносіны да памылак, якія трапляюць у падрыхтаваныя для дзяцей дапаможнікі і падручнікі. Міністэрства слаба працуе з аўтарамі, саромеецца ўказваць ім на памылкі. Таму здараецца так, што Міністэрства ўхваляе асобныя падручнікі, а друкаваць іх нельга.

Гаворачы аб якасці паліграфічнага афармлення і друкарскага выканання выдаваемых кніг, тав. Росман адзначае, што кіраўнікі друкарні імя Сталіна тав. Вержбаловіч і іншыя не робяць сапраўдных вывадаў з той заслужанай крытыкі, якой неаднаразова была падвергнута іх работа, і вельмі шмат спасылаюцца на «аб'ектыўныя» прычыны, не выкарыстоўваюць тыя вялікія магчымасці, якія ёсць у друкарні для павышэння культуры кнігадрукавання.

На нарадзе выступіў з прамовай загадчык сектара аддзела выдавецтваў Кіраўніцтва прапаганды ЦК ВКП(б) тав. Ракін.

Наша большэвіцкая партыя, гаворыць тав. Ракін, няспынна клапоціцца аб стварэнні багацця духоўнай культуры ў нашай краіне. Выданне кніг у нас павялічваецца з года ў год. У мінулым годзе цэнтральнымі і мясцовымі выдавецтвамі СССР было выпушчана звыш 540 мільёнаў экземпляраў кніг і брашур. З кожным годам пашыраюцца маштабы дзейнасці мясцовых выдавецтваў саюзных рэспублік, якія друкуюць кнігі на родных мовах сваіх народаў.

Спыніўшыся падрабязна на становішчы ў выдавецтвах Беларусі, тав. Ракін адзначае павольнасць у рабоце Дзяржаўнага Выдавецтва БССР і Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б у справе выдання на беларускай мове Твораў В. І. Леніна і І. В. Сталіна. Інстытут гісторыі партыі не зрабіўся яшчэ цэнтрам па падрыхтоўцы да друку Твораў В. І. Леніна і І. В. Сталіна на беларускай мове, Інстытут не вядзе навуковай работы па стварэнню адзінай палітычнай тэрміналогіі, якая надзвычай неабходна для забеспячэння высокаякаснага пераклада.

Дзяржаўнае Выдавецтва БССР, гаворыць тав. Ракін, не гледзячы на некаторыя палепшанні ў яго рабоце ў 1948 годзе, усё яшчэ не ліквідавала раду сур'ёзных недахопаў. Выдавецтва мала друкуе кніг, якія абагульняюць перадавы вопыт у прамысловасці і сельскай гаспадарцы рэспублікі, мала кніг і брашур для калгаснай вёскі і для сялян Заходніх абласцей БССР. Выдавецтва не выконвае зацверджаны тэматычны план і ўсё яшчэ нярэдка выпускае ў свет непрыгодныя, а падчас і шкодныя кнігі (напрыклад, кнігу Верацённікава).

Тав. Ракін адзначае далей, што ў газетах і часопісах Беларусі дрэнна яшчэ пастаўлена справа крытыкі і бібліяграфіі.

Работнікі выдавецтваў, пісьменнікі, мастакі, вучоныя, гаворыць у канцы прамовы тав. Ракін, павінны нястомна працаваць над тым, каб совецкаму чытачу даваць больш добрых, ідэйна і мастацкі поўнацэнных кніг.

У спрэчках выступілі таксама таварышы Дадзіёмава (галоўліт БССР), Ляўданскі і Афянгейм (Белдзяржвыдавецтва), Кучар (рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва»), Герцовіч (газета «Звязда»), Зарэцкая (Рэспубліканскі бібліятэчны калектар), Сяльчонак (Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б) і інш.

У канцы нарады з вялікай прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Іаўчук. Ён падрабязна гаворыць аб мерапрыемствах, прынятых ЦК КП(б) Беларусі па ажыццяўленню рашэнняў ЦК ВКП(б) аб ідэалагічнай рабоце, аб дапамозе, якую партыйная арганізацыя рэспублікі аказвае інтэлігенцыі ў авалоданні марксізмам-ленінізмам.

Тав. Іаўчук паказвае, што выдавецтвы, рэдакцыі часопісаў, навуковыя ўстановы мала яшчэ зрабілі для канчатковага пераадолення нацыяналістычных тэорый «адзінай плыні», «залатога веку», нізкапаклонства перад заграніцай, не стварылі яшчэ поўнацэнных навуковых прац і твораў літаратуры аб гісторыі беларускага народа і яго культуры, асабліва ў совецкую эпоху. Тав. Іаўчук указвае, што ў асобных звеннях ідэалагічных устаноў (рэдакцыі Белдзяржвыдавецтва, Інстытута гісторыі партыі, рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» і інш.) усё яшчэ жывуць асуджаныя партыяй тэндэнцыі працаваць па-старому, не абцяжарваць сябе клопатамі аб няспынным росце і ўдасканаленні, аб крытычных адносінах да вынікаў сваёй работы. Тав. Іаўчук разглядае шматлікія памылкі, дапушчаныя Белдзяржвыдавецтвам пры падрыхтоўцы і выданні новых кніг. Ён падкрэслівае, што нельга больш даручаць рэдагаванне кніг і перакладаў людзям непадрыхтаваным, а падчас і нядобрасумленным, як гэта было да нядаўняга часу ў Белдзяржвыдавецтве. У нас для гэтай мэты дастаткова адукаваных і надзейных людзей сярод беларускай совецкай інтэлігенцыі.

Тав. Іаўчук спыняецца на памылках, якія былі зроблены пры распрацоўцы гісторыі беларускага народа і яго культуры, у трактоўцы светапогляду і дзейнасці многіх дзеячоў мінулага. Гэтыя памылкі былі ў часопісах, у асобных літаратурных творах, у газеце «Літаратура і мастацтва».

Падрабязна гаворыць тав. Іаўчук аб недахопах у пастаноўцы крытыкі і бібліяграфіі ў газетах «Звязда», «Совецкая Беларусь», «Літаратура і мастацтва». У «Звяздзе» звялі справу амаль выключна да рэцэнзіравання асобных твораў мастацкай літаратуры і не займаюцца разглядам літаратуры грамадска-палітычнай, навуковай, сельскагаспадарчай і г. д. І «Звязда» і «Совецкая Беларусь» абыйшлі маўчаннем Кастрычніцкую серыю выбраных твораў беларускай совецкай літаратуры. У газеце «Совецкая Беларусь» наогул надрукавана мала рэцэнзій на новыя кнігі, не прыцягваюцца да рэцэнзіравання кніг кваліфікаваныя вучоныя і пісьменнікі, іншы раз дапускаюцца павярхоўныя меркаванні. Газета «Літаратура і мастацтва» не прыцягвае да крытыкі і бібліяграфіі лепшых літаратараў рэспублікі, бывае непаслядоўнай і непрынцыповай у ацэнцы многіх кніг, уводзіць у заблуджэнне сваіх чытачоў кіданнем з адной крайнасці ў другую. Так было з ацэнкай зборніка Янкі Маўра «Вакол свету», а рэцэнзіраваннем аповесці Ус. Краўчанкі «Рыгор Шыбай» і г. д.

У заключэнне тав. Іаўчук гаворыць аб неабходнасці ўсямерна паляпшаць выдавецкую справу ў рэспубліцы, скончыць з адставаннем у друкаванні твораў класікаў марксізма-ленінізма, навуковых прац, буйных твораў совецкай прозы і драматургіі, стварыць у выдавецтвах і навуковых установах бар'ер супроць пранікнення ў кнігі і часопісы памылак, скажэнняў, пранізаць большэвіцкай партыйнасцю ўсю нашу работу па стварэнню літаратуры для кадраў інтэлігенцыі і народа.

„ЦЭНТРАЛЬНЫ ХОД“

Беларускі Дзяржаўны тэатр імя Якуба Коласа распачаў свае гастролі ў сталіцы рэспублікі пастаноўкай п'есы маладых беларускіх драматургаў К. Губарэвіча і І. Дорскага «Цэнтральны ход». П'еса паказвае слаўную дзейнасць вернага сына беларускага народа Канстанціна Заслонава, які зрабіўся адным з самых папулярных і любімых народных герояў, прычым паказвае не адарвана, а ва ўзаемасувязі з агульна-народнай партызанскай барацьбой на Беларусі.

Біяграфічны жанр, як вядома, самы цяжкі і складаны, асабліва ў драматургіі. Ён патрабуе ад мастака не толькі мастацкай праўды, але і захавання той праўды жыцця, якая з'яўляецца першакрыніцай усякага мастацтва. Вымысел, фантазія мастака тут абмяжоўваюцца тым уяўленнем аб героі, якое існуе ў народзе. Асабліва гэта трэба ўлічваць, калі справа ідзе аб стварэнні біяграфіі жывога героя ці героя, які моцна жыве пасля смерці сваёй у памяці народа, у памяці яго саратнікаў і сяброў, у памяці тысяч людзей, якія мелі шчасце ведаць яго, быць сведкамі яго дзейнасці. Але абмяжоўваць сябе толькі дакладнай фіксацыяй таго, што зрабіў або сказаў гэты чалавек, было-б няправільным і аднабаковым. Мастацтва немагчыма без абагульнення. Таму адзіна правільным метадам у стварэнні мастацкай біяграфіі героя павінна быць спалучэнне індывідуальных рысаў характару жывога чалавека з мастацкім абагульненнем.

Аўтары п'есы імкнуліся як мага шырэй ахапіць у сваім творы падзеі, непасрэдным удзельнікам якіх з'яўляўся Заслонаў. Мы бачым Заслонава і ў беларускім штабе партызанскага руху, і на чыгуначным вузле Орша, калі ён вядзе змаганне за «цэнтральны ход» (так называюць чыгуначнікі асноўную магістраль), і на чале партызанскага атрада ў лясах Аршаншчыны.

Аўтары паставілі сваёй задачай таксама паказаць вялікае значэнне і той шырокі рэзананс, які мела дыверсійная і партызанская дзейнасць Заслонава. З гэтай мэтай у п'есу ўведзены, здавалася-б на першы погляд, сцэны, сюжэтна не звязаныя з творам (асабліва першая).

П'еса надзвычай шырока і шматпланава паказвае гераічную барацьбу партызан з нямецкімі захопнікамі. У такой шырыні ахопу падзей—вартасць п'есы (у параўнанні з іншымі п'есамі, у якіх адлюстравана толькі дыверсійная дзейнасць Заслонава). Але ў гэтым—і карэнні тых хібаў, якіх, на жаль, не пазбаўлены гэты твор. Адной з істотных хібаў п'есы з'яўляецца некаторая драматургічная раздробленасць, раз'яднанасць яе. Незлічоная колькасць асобных эпізодаў, часта цікавых і хвалюючых, але не звязаных між сабой, пакідае ўражанне нейкай раскіданасці, расплыўчатасці. У п'есе няма моцнага сюжэтнага стрыжня. За дзеяннем не відаць людзей, іх характараў. Глядач атрымоўвае ўяўленне аб тым, што адбываецца на сцэне, хто дзейнічае, але чым жывуць у гэты час дзейныя асобы, іх унутраны, духоўны свет—усё гэта невядома для гледача. Залішняе захапленне нанізваннем асобных эпізодаў, якія маюць амаль выключна ілюстрацыйны характар, прывяло да таго, што ў спяктаклі не раскрыты ва ўсёй паўнаце і глыбіні вобразы, характары герояў.

У развіцці, правільней было-б сказаць, гаворачы аб гэтым спяктаклі, у раптоўным пераходзе героя з аднаго псіхалагічнага стану ў другі ці раптоўнай перамене яго паводзін часта мала логікі. Як прыклад, можна прывесці ўсю лінію паводзін Салаўёва, або, нават ў большай ступені, партызана, які спачатку абвінавачвае Заслонава ў «няшчасцях» атрада, а потым адным з першых бярэцца за зброю.

Трэба сказаць, што такі стыль п'есы і спяктакля адбіўся і на абмалёўцы характару галоўнага героя, вобраз якога, не гледзячы на ўсе намаганні выканаўцы ролі Заслонава выдатнага актора П. Малчанава, не пакідае ўражання цэласнасці. Ён, як і сама п'еса, як і ўвесь спяктакль, нагадвае цікавы мазаічны малюнак, што складаецца з безлічы асобных яркіх рыс, але ўвогуле не пакідае ўражання яркасці і, тым больш, маналітнасці.

Што-ж у Заслонаве галоўнае, якая рыса характару з'яўляецца ў ім дамінуючай і падпарадкуе сабе астатняе,—мы не бачым. А вядома, што Заслонаў валодаў моцнай воляй і незвычайнай вытрымкай, меў цвёрды характар, які яму ніколі не здраджваў, крыніцай яго гераічных подзвігаў была вялікая любоў да Радзімы, палымяны патрыятызм.

П. Малчанаў пакуль што не здолеў моцна аб'яднаць асобныя кавалкі вобраза, злучыць паасобныя, намечаныя аўтарамі рысы характару героя ў адзін цэласны, маналітны характар. У вобразе, створаным Малчанавым, мала абагульнення. У ім, як і ў спяктаклі, яшчэ шмат лішняга, непатрэбнага. Напрыклад, навошта Заслонаву выконваць у лесе лязгінку? Магчыма, што гэта так было ў жыцці. Але чым гэта ўзбагачае вобраз? Якая цікавая рыса характару героя раскрываецца тут?

Нам здаецца правільнай выразная тэндэнцыя актора пазбавіць вобраз ад непатрэбнага налёту нейкай незразумелай у гэтым характары нервознасці, неўрастэнічнасці, што асабліва заўважалася на першым паказе спяктакля.

Лепш за ўсё правільна намечаныя пошукі галоўнага ў вобразе выяўляюцца ў Малчанава ў канцы другога і ў трэцім акце. Тут ён сабраны, моцны, вытрыманы, упэўнены, не гледзячы на вялікую небяспеку, якая пагражае яму: якраз такі, якім ён захоўваецца ў памяці народа.

Вельмі прыемны знешне і пераканаўчы ўнутрана Ф. Шмакаў у ролі Жэнькі Коржаня. Глыбокім адчуваннем праўды прасякнуты яго паводзіны на сцэне. Сілай праўды і шчырасцю захапляе і артыстка Лагоўская ў невялікай ролі маці Жэнькі. Прыемная, непасрэдная і шчырая Чараднічэнка ў ролі Каці Каляды. Надоўга запамінаецца ў двух эпізодах артыст Казлоў (Салаўёў). Эпізод, у якім ён кідаецца з гранатамі на нямецкі эшалон, па-сапраўднаму хвалюе, хоць аўтары п'есы і не знайшлі тут такіх слоў, якія-б маглі ўзрушыць гледача. Таму так недарэчы ўзнёсла і «літаратурна» гучаць тут апошнія словы Салаўёва: «Вперёд, заре навстречу!». Тут трэба было знайсці нейкія зусім простыя, сціплыя словы, якія іменна сваёй звычайнасцю хапалі-б за сэрца і завяршалі гэты ўдалы эпізод. Разумным, душэўным і разам з тым вельмі сціплым малюе актор Фадзееў вобраз работніка падпольнага райкома Мікалая, затым камісара ў атрадзе Заслонава. Машыністы дэпо, тыпаж якіх у асноўным удала падабраны, на жаль, мала індывідуалізаваны, не запамінаюцца.

Ролі немцаў выконваюцца ў сатырычным плане, які мяжуе часам з буфанадай (напр., немец у турме — Міцкевіч, усе паводзіны якога нагадваюць «рыжага» на арэне цырка) і супярэчыць рэалістычнаму стылю спяктакля. Сцэна ў турме, а таксама ў гаўляйтэра Кубэ, і рэжысёрскі і акторскі вырашаны надзвычай удала, хаця і грэшаць некаторай гратэскавасцю.

Бліскуча выконвае ролю гаўляйтэра «Беларутэніі» Кубэ артыст А. Ільінскі. Ён удала выкарыстоўвае ўсе сродкі сцэнічнай выразнасці—ад гэста, інтанацыі і мімікі да выразнага слова і трапнай дэталі, каб паказаць асабліва яскрава ўвасобленую ў гэтым прадстаўніку «вышэйшай расы» агіднасць і пачварнасць карычневай чумы. Правільна іграе ролю генерал-палкоўніка Мітліца артыст Лазін. Але ў канцы сцэны і яго захапляе стыхія буфонна-гратэскавай манеры, у якой ідзе ўся гэтая сцэна. Магчыма, гэта вынік уладарнага «націску» рэжысёра, які выяўляе ў сцэнах немцаў выразную тэндэнцыю да ўваскрашэння прыёмаў лубка, у якім ворагі звычайна выглядалі карыкатурамі. Таму акторы, што выконваюць ролі немцаў, нагадваюць лялек (арт. Буракоў).

Можна не аспрэчваць правамернасці і такой трактоўкі ворага. Але нам здаецца, што больш правільным было-б у гэтым жанры гераічнай драмы паказаць ворага такім, якім ён быў у сапраўднасці—жорсткім, бязлітасным і небяспечным. Тады больш велічнай паўстане перад вачыма гледачоў гераічная эпапея партызанскай вайны на Беларусі.

Але, не гледзячы на недасканаласць некаторых мясцін у п'есе, на асобныя акторскія няўдачы, якіх, праўда, вельмі мала, спяктакль пакідае добрае ўражанне. Асабліва каштоўнай якасцю гэтага спяктакля з'яўляецца той вялікі аптымізм, якім прасякнуты нават самыя трагічныя яго эпізоды, тая шчырасць, якая ляжыць у аснове акторскага выканання, тыя думкі і пачуцці, якія выклікае ён у гледача. Нямала садзейнічае поспеху спяктакля вельмі ўдалае мастацкае афармленне (мастакі Мардуховіч і Нікалаеў). Так, настрой першай сцэны першага акта ствараецца кінематаграфічным прыёмам, надзвычай удала скарыстаным тут—у цемры ўзнікае шырокае акно, у якім з'яўляецца то перарэзанае промнямі пражэктара трывожнае начное неба, то вежа роднага Крэмля ў першых промнях сонца на світанні, з якой чуваць магутныя гукі гімна Совецкага Саюза.

Тэатр імя Якуба Коласа пасля першых паказаў шмат папрацаваў і значна ўдасканаліў спяктакль.

Няма сумнення ў тым, што тэатр, працуючы над п'есай і спяктаклем далей, пазбавіцца тых недахопаў, якія яшчэ, на жаль, маюцца ў п'есе і пастаноўцы, і ўдасканаліць гэты цікавы спяктакль аб верным сыне беларускага народа, Герої Совецкага Саюза Канстанціне Заслонаве.

Т. БУШКО.

У тэатральным інстытуце

Мы прысутнічалі на экзаменах студэнтаў 3-га курса Беларускага Дзяржаўнага тэатральнага інстытута.

У якасці экзаменацыйных работ інстытут выбраў дзве п'есы—«Мяшчане» М. Горкага (педагог К. Саннікаў) і «Разлом» Б. Лаўрэнёва (педагог Я. Міровіч). Абедзве гэтыя п'есы ўяўляюць сабой багаты навучальны матэрыял.

Метад навучальнай работы Я. Міровіча і К. Саннікава нам здаецца правільным. Відаць, што педагогі імкнуцца абудзіць творчую ініцыятыву студэнтаў, з улікам індывідуальнасці кожнага ўдзельніка спяктакля ствараць вобразы. Толькі ў адным выпадку Саннікаў парушае гэты прынцып. Ён навязаў студэнту В. Станкевічу, выканаўцу ролі доктара, такую знешнюю характэрнасць, якая ніяк не звязана з сутнасцю вобраза. У выніку атрымалася знешняя і непераканаўчая ігра.

У спяктаклі «Мяшчане» вельмі правільна і праўдзіва перадае характар Тацяны студэнтка Э. Герасімовіч. У яе паходцы, манеры размаўляць, у яе позірку мы чытаем безвыходнасць існавання, смутак і, разам з тым, моцны пратэст, нежаданне мірыцца з бессэнсоўным жыццём. Другая выканаўца гэтай ролі—Л. Андрэева ідзе сваім шляхам у стварэнні вобраза, яна раскрывае толькі безвыходнасць існавання Тацяны. І. Ганусевічу ў ролі Бессяменава трэба папрацаваць над інтанацыйным малюнкам вобраза. Пакуль што інтанацыйная аднастайнасць перашкаджае стварэнню поўнацэннага вобраза.

У ролі жонкі Бессяменава паказалі сябе студэнткі Н. Кароткіна і Е. Калеснікава. У кожнай з іх ёсць цікавыя месцы ў спяктаклі, але ёсць і агульны недахоп. Ім не ўдаецца яшчэ ў поўнай меры перадаць другую лінію вобраза — хваляванне за дзяцей, імкненне зберагчы іх і тым самым захаваць сям'ю.

Блізкія да правільнага раскрыцця вобраза Пятра выканаўцы А. Бутакоў і А. Гутковіч, хаця і ў аднаго і ў другога месцамі назіраецца няроўнае выкананне.

Ні В. Карпілаў, ні В. Станкевіч яшчэ не дасягнулі ўсяго магчымага ў перадачы вобраза Ніла. У іх выкананні Ніл ператвараецца ў рэзанёра. Трэба папрацаваць яшчэ над паглыбленнем вобраза. Паводле сваіх дадзеных, студэнт І. Эйдэльман не адпавядае ролі пеўчага Цецерава—ні яго голас, ні знешні выгляд не падыходзяць да горкаўскага героя.

Студэнткі Д. Шпакава ў ролі Полі і Л. Федчанка ў ролі Ялены паказалі сябе паспяхова. Яны ідуць правільным шляхам у стварэнні вобразаў. Занадта непасільнай творчай задачай з'явілася роля Пярчыхіна для студэнта М. Калачыка. Мы ўбачылі толькі самыя агульныя накіды вобраза.

Педагогу Саннікаву ў далейшай рабоце над «Мяшчанамі» неабходна звярнуць яшчэ большую ўвагу на правільнае раскрыццё горкаўскай філасофіі, паглыбіць вобразы, дамагацца ад выканаўцаў большага ўнутранага кантакта.

У спяктаклі «Разлом», які з'явіўся не менш сур'ёзнай работай у авалоданні акторскім майстэрствам, мы можам выявіць прыкладна тыя-ж самыя вартасці і недахопы. Напрыклад, калі ў ролі Бярсенева студэнт В. Станкевіч дастаткова пераканаўчы, дык у ролі Гадуна ў яго прыкметна напружанне, адсутнічае патрэбная сувязь з партнёрам. Студэнтка Сокалава ў ролі Ксені спачатку ідзе па знешняй лініі, а потым трапляе на правільны шлях раскрыцця ўнутранага жыцця вобраза.

Паспяхова паказалі сябе Бутакоў і Гутковіч у ролі Лео, Дыгайла ў ролі Маці, і Калачык у ролі Матроса. У цэлым спяктакль і асобныя вобразы вырашаны правільна.

Якія вывады мы можам зрабіць пасля прагляду двух работ студэнтаў 3-га курса? Педагогі і студэнты павінны звярнуць сур'ёзную ўвагу на правільныя ўзаемаадносіны партнёраў, глыбокае раскрыццё тэкста, апраўданае самаадчуванне і паводзіны ў заданых абставінах, павінны дамагацца ўнутранай сабранасці выканаўцаў і большай яркасці ў стварэнні вобразаў.

Поспехі асобных студэнтаў паказваюць, што шлях работы педагогаў Я. Міровіча і К. Саннікава правільны. Але студэнтам Беларускага тэатральнага інстытута яшчэ неабходна многа папрацаваць, каб стаць сапраўднымі майстрамі сцэны.

Ул. НЯФЕД.

На выпускных экзаменах

Закончыліся заняткі і адбыліся выпускныя экзамены ў драматычнай студыі тэатра імя Янкі Купалы. Навучанне будучых актораў на працягу трох гадоў шчыльна было звязана з практычнай работай у тэатры.

Заліковая праграма была пабудавана, як і ўвесь працэс навучання, з выключна практычным ухілам: былі ўзяты сцэны з пастаўленых у тэатры імя Янкі Купалы п'ес, каб студыйцы пасля заканчэння вучобы адразу маглі ўвайсці дублёрамі ў спяктаклі. На праглядзе выявілася, што як педагогі (Л. Літвінаў і В. Галіна), так і студыйцы імкнуліся да таго, каб захаваць традыцыі акторскага майстэрства старэйшага ў рэспубліцы тэатральнага каляктыва.

Найбольш удалай работай студыі трэба лічыць спяктакль «Апошнія» М. Горкага (скарочаны варыянт). Не гледзячы на тое, што ўвесь спяктакль паказваўся ў «выгарадках» (без дэкарацый), без гарнітураў і грыма, студыйцам удалося перадаць асноўнае—характары персанажаў і агульны настрой спяктакля. А гэта ўжо сведчыць аб тым, што студыйцы добра зразумелі, як трэба будаваць сцэнічны вобраз і якімі сродкамі неабходна карыстацца для таго, каб зрабіць яго больш даходлівым для гледача.

Цікава выкананы ў гэтым спяктаклі жаночыя ролі. Студыйка Л. Чыжэўская выконвае ролю Соф'і. Мы бачым у Соф'і ўнутранае хваляванне, стрыманасць і, разам з тым, паслядоўнасць у паводзінах. Маладая артыстка не капіруе вобраз, створаны ў тэатры. Яна стварае самастойны псіхалагічны вобраз, засвойваючы ўсё лепшае, што ёй дала выканаўца гэтай ролі—педагог і артыстка тэатра імя Янкі Купалы В. Галіна.

Своеасабліва трактуе В. Краўчанка лёгкадумную і хітрую Надзею. Гэта хцівая жанчына, якая дзеля набыцця багацця не грэбуе ніякімі сродкамі.

Цяжкая для выканання роля старой няні (студыйка Е. Кавалёва). Яна як-бы нямая сведка ўсёй гэтай чалавечай камедыі, якая разыгрываецца ў доме Каламійцавых. Роля няні не многаслоўная, але прысутнасць гэтага персанажа адчуваецца на сцэне, бо маладая артыстка ўвесь час жыве ў вобразе. Непасрэднасць, жыццёвасць і прастата —вось што характэрна для ігры Кавалёвай, якая добра пачынае свой творчы шлях.

Мы ўбачылі і дублёраў. Ролю Любы іграл дзве выканаўцы. Г. Уладамірская паказала нам Любу, якая ўвесь час змагаецца за свае правы ў сям'і. Я. Рынковіч значна паглыбіла гэты вобраз, больш поўна раскрыўшы ўнутраны свет зняважанага чалавека.

Па-рознаму іграл студыйкі і ролю Веры. У К. Бобчы гэта лёгкадумная дзяўчынка. У Н. Краўцовай — да юнацкіх рысаў Веры дадаецца яшчэ і сіла пратэсту, што падымае вобраз да асуджэння навакольнага асяроддзя.

Хаця мужчынскія ролі сыграны ў спяктаклі слабей, але і яны пакідаюць пэўнае ўражанне, таму што вырашаны ў псіхалагічным плане. Каламійцаў І. Сіповіча нахабны, грубы, цынічны, дэспатычны і бяздушны паліцэйскі, яго сын Аляксандр (Т. Кін-Камінскі) ва ўсім імкнецца наследаваць бацьку,—ён такі-ж распуснік і п'яніца, а малодшы сын Каламійцавых Пётр (В. Кудрэвіч)—неўраўнаважаны юнак. Надломленасць, бездапаможнасць юнака мяшчанскага асяроддзя добра перададзена студыйцам. Хітры і здрадлівы доктар Лешч М. Лапідусам паказаны непрыемным чалавекам.

Не ўдаліся ў спяктаклі Якаў (І. Барадзін) і Якараў (М. Бацян). Выканаўцы не зразумелі прычыны паводзін гэтых персанажаў і таму не здолелі пераканаўча і праўдзіва раскрыць вобразы.

Паказ першага акта з камедыі маладога беларускага драматурга Ю. Рудзько «Дарагі госць» сведчыць аб тым, што студыйцы добра адчуваюць жанр камедыі і могуць самастойна ствараць цікавыя вобразы. Маладая і вясёлая звеннявая Галя (Е. Кавалёва), падкрэслена-камедыйны рахункавод Сямён (В. Кудрэвіч), сатырычны персанаж—загадчык сельпо Лізунок (М. Лапідус), — пацверджанне гэтаму. Удала, з добрым пачуццём праўды сыграны ролі старшыні калгаса Лукаша Гардзеіча (І. Сіповіч) і яго брата Васіля Гардзеіча (Т. Кін-Камінскі). Невыразнымі атрымаліся вобразы Піліпа Архіпыча (І. Барадзін), Андрэя (М. Бацян) і Валі (Г. Уладамірская).

Захапленне прысутных выклікала вольная слухачка студыі Н. Краўцова сваім выкананнем ролі Джульеты ў сцэнах з трагедыі «Рамео і Джульета» В. Шакспіра. Здольнасці гэтай маладой выканаўцы да рамантычных і гераічных роляў выявіліся яшчэ ў мінулым годзе, калі яна выконвала маналог Лаўрэнсіі з «Авечай крыніцы» Лопе-дэ-Вега. Краўцова глыбока адчувае вобраз і так пераканаўча паказвае закаханую дзяўчыну, што шчыра верыш ёй. Яна ўся аддаецца пачуццям і жыве ў ролі, якую выконвае. Вельмі цікава сыграна роля няні студыйкай Е. Кавалёвай. М. Зінкевіч паказвае няню толькі ў камедыйным плане, пазбаўляючы яе чалавечай прывабнасці.

Фрагмент сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошні» К. Крапівы менш удаўся, таму што М. Зінкевіч ролю жонкі Гарлахвацкага амаль поўнасцю капіруе са спяктакля тэатра, а М. Лапідус вобраза Гарлахвацкага не стварыў.

У сцэне з другога акта камедыі «Дура для іншых, разумная для сябе» Лопе-дэ-Вега мы зноў убачылі Я. Рынковіч у ролі Дыяны, для выканання якой у студыйкі нехапіла лёгкасці і свабоднай ігры. Даволі цікавыя вобразы створаны Л. Чыжэўскай (Тэадора), Т. Кін-Камінскім (Александро) і В. Краўчанка (Феніза), але ўсё-ж трэба адзначыць, што рэалістычныя вобразы сучасных беларускіх п'ес і п'ес Горкага для студыйцаў значна бліжэй, чым вобразы рамантычныя. Тут якраз і выявілася школа тэатра імя Янкі Купалы, тэатра рэалістычнага кірунку. Прыемна, што лёс сучаснага героя па-сапраўднаму хвалюе маладых артыстаў. Гэта добра, бо на вобразах сучасных герояў рускай і беларускай совецкай драматургіі вырасталі нашы лепшыя артысты. Пажадаем-жа і студыйцам у добры час—расці і сталець на вобразах нашых сучаснікаў.

А. ЕСАКОЎ.

Першы выпуск харэаграфічнага вучылішча

Для хутчэйшага папаўнення балетнага каляктыва тэатра оперы і балета тры гады таму назад у харэаграфічным вучылішчы была створана група паскоранага тыпу, якую цяпер закончылі 11 чалавек.

У надзвычай цяжкіх умовах першага году пасля звароту ў вызваленны Мінск вучылішча здолела даць неабходныя зеды сваім выхаванцам як у аб'ёме курса спецыяльных дысцыплін (класічны, характарны, гісторыка-бытавы, дуэтна-класічны і беларускі танцы, майстэрства актора), а таксама ў аб'ёме агульнаадукацыйнага курса сярэдняй школы.

Добрая падрыхтоўка студэнтаў гэтай групы дазволіла вельмі хутка выкарыстаць большасць іх у балетных спяктаклях тэатра, у асобных выпадках нават у сольных партыях. У гэтым вялікая заслуга педагогаў — С. Паўлава, В. Дудко, Н. Золатавай, Т. Узунавай і Б. Мардвінава, якія далі сваім выхаванцам максімум ведаў, дзякуючы чаму за вельмі кароткі гэрмін вучылішча выпусціла поўнацэнных артыстаў балета.

ГАСТРОЛІ АРКЕСТРА НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Беларускі Дзяржаўны аркестр народных інструментаў Філармоніі БССР пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі І. Жыновіча наведаў Асіповічы, Брэст і Маладзечна. Аркестрам у складзе 40 чалавек дырыжыраваў М. Рыўкін. У канцэртах былі выкананы творы беларускіх кампазітараў: Я. Цікоцкага, Р. Пукста, Н. Сакалоўскага, П. Падкавырава, Р. Камінскага, а таксама рускія і беларускія народныя песні.

Разам з аркестрам выступалі саліст - цымбаліст А. Астрамецкі, артысты І. Балоцін, Я. Байрашэўская, У. Таланкін, М. Ворвулеў.

Сцяпан МАЙХРОВІЧ

ПАЭЗІЯ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЫ І ТВОРЧАЙ ПРАЦЫ

Сярод лепшых твораў беларускай совецкай літаратуры, выпушчаных у свет Дзяржаўным Выдавецтвам БССР у азнаменаванне трыццацігоддзя Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, зборнік вершаў Піліпа Сямёнавіча Пестрака*) па праву займае сваё заслужанае месца.

Ужо раннія вершы і паэмы (1927—1930 г.г.) Піліпа Пестрака, змешчаныя ў зборніку, поўныя рэволюцыйнага пафаса, глыбіні думкі і свежых пачуццяў. Яны не толькі вызначаюць ідэйную накіраванасць усёй творчасці паэта, але і з'яўляюцца жывой ілюстрацыяй яго грамадска-палітычнай біяграфіі. І гэта натуральна, таму што творчасць мастака неаддзяліма ад яго светапогляду, яна арганічна звязана з яго ідэалогіяй.

З гэтага пункту гледжання ўсё створанае Піліпам Пестраком больш чым за дваццаць год літаратурнай дзейнасці і сабранае ў новым зборніку з'яўляецца маналітна адзіным, непасрэдным увасабленнем у вобразах перадавых, рэволюцыйных ідэй. Вось чаму яго паэзія, — няхай не ўся яна роўная ў мастацкіх адносінах, — і характарызуецца ярка выражанай свядомай творчай воляй. Паэт ніколі не зыходзіў з готых пачуццяў, таму што гэтыя апошнія непазбежна вынікалі з рэволюцыйнай накіраванасці яго творчасці, былі народжаны ідэяй і выражалі гэтую ідэю. Інакш не магло быць, таму што рэальная рэчаіснасць «дае мастацтву, як сцвярджаў Чарнышэўскі, ідэю, а творчая фантазія—вобразы для выражэння гэтай ідэі».

З гэтым крытэрыем і трэба падыходзіць да аналіза паасобных твораў Піліпа Пестрака, што складаюць зборнік «Выбраных твораў».

Зборнік гэты па самой сваёй унутранай канструкцыі з'яўляецца як-бы сімвалічным выражэннем творчай біяграфіі самога паэта. Кніга дзеліцца на дзве часткі: даваеннёўская творчасць паэта (1927—1939 гг.) і пасляваеннёўская (1939 — 1947 г.г.). Кожная з гэтых частак абдымае два розныя перыяды літаратурнай і грамадска-палітычнай дзейнасці паэта: ва ўмовах суровага прыгнёту панскай Польшчы і на свабоднай совецкай зямлі.

І калі важна мець на ўвазе, што Піліп Пестрак як паэт фармаваўся не на свабодзе, а ў казяматах турмаў панскай Польшчы, то не менш важна і другое: суровыя гады зняволення не зламалі яго рэволюцыйнага духу, не падарвалі яго веры ў народ, у перамогу над прыгнятальнікамі.

Вось чаму ў даваеннёўскай творчасці паэта заўсёды перамагаў жыццесцвярджальны, рэволюцыйны пачатак, і яго паэзія напоўнена незгасальным аптымізмам, светлай верай у няўхільны рух наперад да свабоды і незалежнасці народа, супроць беларуска-польскіх акупантаў.

У паэме «Ганцы», напісанай у Пружанскай турме ў 1930 годзе, Піліп Пестрак заклікае народ выйсці

... З цемры на прасцяг,
На высокія на горы,
Ахіні ты зрокам зоры —
Нам смяецца шлях.
Нам зайграюць ветрагоны,
Запяюць нам песні буры —
Нашы родныя загоны
Скінуць змрок пануры.
Небасхіл зарою новай
Заірдзеўся ўжо для нас,
З шумам кажа лес сасновы:
Час выходзіць, час!

Гэтая паэтычная араторыя з'яўляецца найбольш уласцівай таленту паэта формай выяўлення пафаса рэволюцыйнай барацьбы народа супроць акупантаў.

Дай, паэзія, меч прамяністы,
Слова-гарт, слова-кліч, слова-бой.
Дай палёт мне арліны, агністы,
Гімнам-полымем біць да нябёс.

Гэты бадзёры, аптымістычны тон, кліч на бой супроць социяльнага і нацыянальнага прыгнёту і характарызуе палітычнае аблічча лірычнага героя паэта. Герой гэты — не замкнёны ў самім сабе, у сваёй уласнай шкарлупе рэволюцыянер-адзіночка, што ўзбунтаваўся супроць социяльнага зла і гвалту. Зусім не. Гэта — свядомы рэволюцыйны змагар, тыповы прадстаўнік незлічонай народнай арміі, што ўзнялася на рашучы бой супроць спрадвечных ворагаў — польскіх паноў.

Пафас яго рэволюцыйнай барацьбы несакрушальны, таму што свядомая воля да змагання супроць прыгнятальнікаў, творчае прадбачанне рысуюць светлы вобраз свабоднай, уз'яднанай у адзінай беларускай совецкай дзяржаве Заходняй Беларусі — роўнапраўнага члена вялікай совецкай сям'і:

Калі зары чырвонай шквал
Змяце сляды навалы панскай,
Уладарны прыдзе аграном,
Збярэ сыноў сям'і батрачай...
І на штандары ён назначыць:
«Усё для народа...».

Іменна ў гэтым заключаўся ўвесь сэнс жыцця, уся філасофія палітычнай барацьбы народных мас супроць акупантаў:

Прыдзе час — ператнём і гарляку,
І той панскі падвоены карк, —

усклікаў паэт, поўны нязломнай веры ў творчыя рэволюцыйныя сілы народа. І калі мары аб сонечным краі Советаў сталі рэальнай рэчаіснасцю, тады вольналюбівы, самаадданы ў барацьбе беларускі народ, якому Піліп Пестрак прысвяціў не адну ўсхваляваную страфу, з пачуццём вялікай радасці ўсклікнуў словамі паэта:

Краіна родная! Вітай зару
збаўлення...
Хай згіне жаль тых вузенькіх
палосак
І песня сумная гаруючай жняі,
Хай згіне крык душы забітых,
брудных вёсак
І смерць над панам-катам хай
грозна зазвініць.

Пасля гістарычнага Семнаццатага верасня 1939 года творчасць Піліпа Пестрака набывае новае социяльнае гучанне. Вершы яго поўны пафаса перамогі над панамі, поўны апявання ўрачыстасці народнай справядлівасці над светам цемры і гвалту. Выяўляючы самыя цёплыя, задушэўныя пачуцці народнай любві да вялікага Сталіна, які прынёс народу вызваленне, паэт скрозь сучаснае пановаму асэнсоўвае недалёкае мінулае, і творчасць яго напаўняецца самай шчырай, абаяльнай паэтызацыяй гістарычных социяльных пераўтварэнняў на вызваленых заходне-беларускіх землях, пераўтварэнняў, аб якіх народ марыў на працягу многіх гадоў.

На жаль, раздзел гэты не ахапляе сабою ўсяго таго, што напісана паэтам у перыяд 1939—1941 гадоў.

Аднак і нешматлікія вершы, уключаныя ў зборнік, даюць уяўленне аб творчым абліччы пісьменніка ў тыя векапомныя дні.

У цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны паэт застаўся верным раз дадзенай клятве і пяро сваё «прыраўняў да штыха». Яго ваенная лірыка, багата прадстаўленая ў зборніку, выражае шчырую, сардэчную любоў народа да сваёй совецкай маці-Радзімы і гатоўнасць крывёю адстаяць яе свабоду і незалежнасць.

... Уздымайце моц грудзей.
Хай знае вораг сілу нашае
трывогі,
Хай у памяці яму навекі стане
дзень,
Дзень нашай страшнай помсты-
перамогі,
Калі з слязою радасці у громах мы
прыдзём

І вернемся на родныя дарогі —

мужна гучэў голас паэта і заклікаў на рашучы бой супроць гітлераўскіх захопнікаў.

У гады мірнай стваральнай працы паэзія Піліпа Пестрака па-ранейшаму застаецца на ўзроўні задач дня, што паставіў перад сабою наш народ у пасляваеннай сталінскай пяцігодцы.

Аднак, трэба зазначыць, што не ўсе пасляваенныя вершы паэта знаходзяцца на ўзроўні вялікіх патрабаванняў народа да мастацкага слова. Ад канстатацыі голага факта перамогі над ворагам пара перайсці і да глыбокага ідэйнага і высокамастацкага адлюстравання гераічнай стваральнай працы нашага народа. Мала сказаць:

Бачу, пільна працуеш —
Працуй.

Герой нашых дзён, чалавек творчай працы, не мае патрэбы ў такой «мастацкасці». Ён заслугоўвае таго, каб яго велічны вобраз знайшоў сваё глыбокае, сапраўды паэтычнае ўвасабленне ў вершах, паэмах, аповесцях і раманах, з усім багаццем яго дум, пачуццяў і імкненняў самаахвярна працаваць на карысць сваёй социялістычнай бацькаўшчыны.

Пажадана таксама, каб таленавіты паэт Піліп Пестрак хутчэй пазбаўляўся і ад чыста фармальных хібаў у сваёй творчасці.

Часамі штучна ўжываемая інверсійнасць будовы верша абцяжарвае яго, псуе мілагучнасць і пазбаўляе вобраз мастацкай яснасці і выразнасці («Дрыжанне сэрца чалавечага ў цісках», стар. 183, «Народнай помстай, паўстаўшай, грознай», стар. 124).

Больш таго, час ад часу паэт траціць густ да вобразнага мышлення, інакш у яго вершах не сустракаліся-б так часта зусім непатрэбныя празаізмы, варожыя самой прыродзе лірычнага верша («Сустрэць тут цябе не чакаў», стар. 141, «Не магу не зірнуць... і на спрыт тваіх рук», стар. 169, «Ты збудзі мяне, маці, рана, як пачнуць выганяць кароў», стар. 44). Немілагучна, дысанансам гучыць і такая звышметафарычнасць, якой часта злоўжывае паэт, накшталт: «Нож маёй думкі маланкуе іскрай» (стар. 26).

Тым не менш, пры ўсіх гэтых фармальных хібах і, падчас, стылістычных і вобразных неахайнасцях, творчасць Піліпа Пестрака — глыбока-ідэйная і палітычна завостраная па свайму актуальнаму гучанню.

Трэба спадзявацца, што паэт, вызваліўшыся ад недахопаў, дасць новыя, больш дасканалыя мастацкія творы.

*) Піліп Пестрак, «Выбраныя творы», стар. 190, Дзяржаўнае Выдавецтва БССР, Мінск, 1947 г.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.
Рэдкалегія: П. ПАНЧАНКА, А. КУЧАР (нам. рэдактара), М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, М. КАЦАР, К. САННІКАЎ, П. ПАДКАВЫРАЎ, М. БЛІСЦІНАЎ.

АТ 02301 Адрас рэдакцыі: Рэволюцыйная, 3. Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэволюцыйная, 12.